Т. Л. Ляшчынская С. С. Аніскевіч

# Беларуская мова



4

Частка 1

# Мы заўсёды разам










Дзяўчынка і хлопчык
што робіць?
што зрабіў?
што зрабіла?





Дзяўчынка і хлопчык
што робіць?
што зрабіў?
што зрабіла?





Т. Л. Ляшчынская С. С. Аніскевіч

# Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік
для 4 класа першага аддзялення
дапаможнай школы
з беларускай мовай навучання

У 2 частках

Частка 1

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

2-е выданне, перапрацаванае

Мінск «Народная асвета» 2020

Правообладатель Народная асвета

УДК 811.161.3(075.2=161.3)-056.313
ББК 74.3
Л99

Р э ц э н з е н т ы:

кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (дацэнт кафедры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт *А. Г. Міхалевіч*); настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Ельская дапаможная школа-інтэрнат» *С. В. Фяськова*

Фота на вокладцы *А. П. Дрыбаса*

## Умоўныя абазначэнні:

— правілы.

* — практыкаванні павышанай складанасці.

 — «Паразмаўляем» (камунікатыўныя практыкаванні).

 — «Хвілінка-весялінка» (практыкаванні займальнага характару).

 — «Рухальная хвілінка» (практыкаванні з рухальнай актыўнасцю).

 — «Слоўнік».

ISBN 978-985-03-3512-8 (ч. 1)
ISBN 978-985-03-3511-1

© Ляшчынская Т. Л., Чэркас А. Л., 2011
© Ляшчынская Т. Л., Аніскевіч С. С., са змяненнямі, 2020
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2020

Правообладатель Народная асвета

# ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА Ў 3-М КЛАСЕ

## *Урок 1*

**1.** Прачытайце верш. Разгледзьце малюнак.



Адшумела лета каласамі,
адспявала ў пушчы і ў бары.
Клас заліўся звонка галасамі,
і за парты селі мы, сябры.

*А. Дзеружынскі*

Куды прыйшлі дзеці? Які ў дзяцей настрой?
Хто іх сустракае? Што прынеслі дзеці ў школу?
Каго са сваіх сяброў вы сустрэлі?
З кім вы сядзіце за партай?



Правообладатель Народная асвета



## Паразмаўляем

**2.** Паслухайце.

Добра, калі ты змалку
можаш вітаць людзей.
Раніцай: «Добрага ранку!»
І апаўдня: «Добры дзень!»
Увечары пры сустрэчы
знаёмым сказаць:
«Добры вечар!»
А соннаму сонейку нанач
і ўсім добрым людзям:
«Дабранач!»

*В. Вітка*

Пакажыце з суседам па парце, як вы раніцай вітаеце адзін аднаго. Іншыя дзеці адзначаюць, чые прывітанні ім спадабаліся больш за ўсё.

Узор.

— Добрай раніцы, Сяргей.
— Добрай раніцы, Міша.

* * *

— Аленка, добры дзень!
— Добры дзень, Васілька!

* * *

— Добрай раніцы, Ганна Васільеўна!
— Добрай раніцы, Ягор!

**3.** Прачытайце імёны. Гучна і выразна скажыце сваё ім́я.

Ягор, Васіль, Яніна, Крысціна, Міша, Галіна, Алена, Мікіта, Ірына, Марыя, Юрый, Марына, Аксана.



Правообладатель Народная асвета

Выпішыце з дадзеных імёнаў па тры імёны дзяўчынак і хлопчыкаў. Пішыце імёны з вялікай літары.

Запішыце сваё імя.

Складзіце і запішыце сказы з двума імёнамі (на выбар).

* **4.** Прачытайце тэксты.

1. Ёсць расліна з дробным лісцем і маленькімі ружовымі кветкамі. Называецца гэта расліна верас.

2. У другім месяцы восені труць лён. Сыплецца з яго кастрыца.

3. У трэцім месяцы восені падае з дрэў лісце.

Чаму месяцы восені так называюцца? Запішыце тры сказы з назвамі месяцаў восені.

Першы месяц восені … .
Другі месяц восені … .
Трэці месяц восені … .

## *Урок 2*

**5.** Прачытайце верш В. Вярбы.

**Гусі клічуць у вырай**

Гусі клічуць у вырай,
і туманы на беразе,
нізка вербы старыя
нахіліліся ў верасні.

Дзе ты, лета, з уцехамі,
ягад кошыкі поўныя…

Назавіце прыметы восені.

Раскажыце пра пацехі летам. Запішыце, чым вы займаліся летам.

Словы і спалучэнні слоў для даведкі: *купаліся, загаралі, збіралі грыбы і ягады, хадзілі ў паходы, адпачывалі ў лагеры.*



Правообладатель Народная асвета

**6.** Прачытайце.

### Верасень

Багаты месяц Верасень! Ён падараваў зямлі пышныя шаты. Насыпаў поўныя засекі збожжа. Апрануў у золата лясы і расквеціў верасы.

Таму і завуць яго Верасень.

*Паводле К. Каліны*



## Слоўнік

**Ша́ты** — *тут*: покрыва з лісця.

**Засе́кі** — адгароджанае месца для захоўвання збожжа.

Чаму Верасень лічаць багатым месяцам?

Што Верасень падараваў зямлі?

Што ён насыпаў у засекі?

Чаму гэты месяц называецца вераснем? Што цвіце восенню?

Запішыце адказы на тры апошнія пытанні. Вам дапаможа тэкст.



## Рухальная хвілінка

**7.** Слухайце і паказвайце рухамі, што робяць лісточкі.

Мы, асеннія лісточкі, на галінках сядзелі, падзьмуў вецер — мы паляцелі. Ляцелі мы, ляцелі, на зямлю ціха селі.

Вецер дыхнуў, лісце зноў закруцілася. Закружыліся, паляцелі і зноў лісточкі ціха селі.



Правообладатель Народная асвета

**8.** Разгледзьце малюнкі. Што робяць людзі? У якую пару года выконваюць гэтыя дзеянні?



Пакажыце, як капаюць бульбу, зграбаюць лісце, збіраюць яблыкі.

Запішыце назву пары года і дзеянні, якія вы паказвалі.

Спалучэнні слоў для даведкі: *капаем бульбу, зграбаем лісце, збіраем яблыкі.*

## *Урок* 3

**9.** Прачытайце. Спішыце.

### Сяброўкі

Алена і Маруся сябруюць даўно. Яны пазнаёміліся яшчэ ў дзіцячым садку. Сяброўкі вучацца ў адным класе. Дзяўчынкі разам ходзяць у школу ўжо чацвёрты год.

У якім класе вучацца Алена і Маруся?
З кім вы сябруеце?



Правообладатель Народная асвета

З кім вы ходзіце ў школу? (З бабуляй, дзядулем, сябрам, сяброўкай, мамай, татам.)

Закончыце сказы і запішыце іх.

Я сябрую з ... .
Я хаджу ў школу з ... .

* **10.** Будзьце ўважлівымі. Разгледзьце дзяўчынак на малюнках. Прачытайце сказы пад малюнкамі.



У Марусі блакітныя вочы і кароткія чорныя валасы. У Аленкі вочы карыя, а валасы доўгія і светлыя.

Пакажыце, на якім малюнку Аленка, на якім — Маруся.

Адкажыце на пытанні (на малюнкі не глядзіце).

1. Якога колеру вочы ў Аленкі? Якога — у Марусі?
2. Якога колеру валасы ў Аленкі? Якога колеру валасы ў Марусі?

Запішыце ў сшытку па памяці сказы пра Марусю і пра Аленку.

Праверце адзін у аднаго работы: ці правільна вы напісалі?

Словы для даведкі: *доўгія, кароткія, светлыя, чорныя; блакітныя, шэрыя, чорныя, зялёныя.*



Правообладатель Народная асвета

**11.** Раскажыце пра сябе.

1. Якога колеру ў вас вочы?
2. Якія ў вас валасы: доўгія ці кароткія?
3. Якога яны колеру?

Запішыце адказы. Памяняйцеся сшыткамі з вучнем папярэдняй парты. Праверце адзін аднаго: ці правільна вы напісалі?

Раскажыце вучню з папярэдняй парты, які ён.

Спытайцеся ў яго пра сябе. Які ці якая вы?

Словы для даведкі: *добрая, ветлівы, працавіты, дужы, адказная.*

**12.** Прачытайце верш.

**Верасень**

Мне Верасень руку падаў:
— Ты ў школу свой партфель сабраў?
— Сабраў партфель, і сам сабраўся,
і з вольным летам развітаўся.
— Куды ж цяпер твой дзень імчыцца?
— Вучыцца, Верасень, вучыцца.

*С. Панізнік*

Адкажыце на пытанні Верасня.

Пакажыце ў пары, як вы збіраеце свой ранец.

Якія школьныя рэчы вы паклалі ў яго?

Словы для даведкі: *аловак, ручка, гумка, сшыткі, пенал, падручнікі.*



Правообладатель Народная асвета



## Паразмаўляем

**13.** Паразмаўляйце з суседам па парце пра яго ўчынкі.

Узор.

— Я сёння дапамагаў малодшай сястры адзявацца. А ты каму дапамагаў?

— А я дапамог свайму брату-першакласніку сабраць ранец.

* * *

— Я частаваў сяброў яблыкамі з нашага саду. А ты каго частаваў?

— Я частаваў дзяўчынак нашага класа цукеркамі.

### *Урок 4*

**14.** Прачытайце верш па чарзе.

**Залатая казка**

Нам гасцінна дзверы
восень адчыняе.
У залатую казку
восень запрашае.

У яе садочку
яблыкі паспелі.
Пацеркі рабіны
зноў зачырванелі...

*Я. Жабко*

Куды восень запрашае дзяцей? Які садочак восенню? Ён непрыгожы ці прыгожы, казачны?

Што паспела ў садах?

Што сталася з пацеркамі рабіны?



Правообладатель Народная асвета

Пакажыце, як вы будзеце збіраць яблыкі і нанізваць пацеркі рабіны (рабіць з іх кара́лі).

Спішыце другі слупок верша. Падкрэсліце ў сказах верша словы — назвы прадметаў прамой лініяй.

**15.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце агародніну і садавіну. Што вам больш падабаецца з садавіны і агародніны?



Намалюйце ў сшытку два кошыкі. На адным кошыку напішыце слова *садавіна,* на другім — *агародніна*. Запішыце словы пад кошыкамі па ўзоры.

Узор.



**Садавіна**
*вішні*



**Агародніна**
*морква*

Словы для даведкі: *вішні, яблыкі, морква, грушы, памідоры, слівы, агуркі, цыбуля.*



Правообладатель Народная асвета

**16.** Прачытайце.

### Кампот

Маленькая Галя любіць дапамагаць маме. Вось і сёння мама даручыла дачушцы Галі памыць сушаныя яблыкі для кампоту.

За абедам пілі кампот. Тата адпіў крыху з кубка і зірнуў на маму. Мама зрабіла глыток і паглядзела на Галю.

— Дачушка, ці добра ты памыла яблыкі?

— Так, мамачка, — адказала Галя, — вельмі добра. Я іх нават мылам намыліла!

*Паводле К. Каліны*

Што з'яўляецца недарэчным у гэтай гісторыі?

Чаго не ведала маленькая дзяўчынка?

Растлумачце дзяўчынцы, як трэба мыць сушаныя фрукты.



### Хвілінка-весялінка

**17.** Прачытайце.

У нядзелю ўсе былі дома. Паселі абедаць. Падалі засмажаную курыцу.

— Мне ножку! — заказала Валя.

— І мне ножку! — крычыць Галя.

— І мне таксама ножку! — просіць Архіп.

— Чаго вы крычыце? Хіба курыца — сараканожка? — гаворыць Піліп.

Колькі ў курыцы ножак?

Чаму вучыць вас гэты жарт?



Правообладатель Народная асвета

## Урок 5

**18.** Праслухайце апавяданне.

### Хто каго перакрычыць?

Максімка з дзедам пайшлі ў грыбы. Хораша ў лесе! Хлопчык знайшоў лісічкі і стаў іх зразаць. Раптам ён заўважыў, што дзядулі побач няма. Максімка дрыжачым голасам паклікаў:

— Дзеду!

І ў той жа момант нехта непадалёку хлопчыку адазваўся:

— Ду-ду! Ду-ду!

— Ау! — грамчэй крыкнуў хлопчык.

Хтосьці некалькі разоў паўтарыў: «Ау! Ау!»

Максімка склаў рупарам далоні і закрычаў:

— Дзеду, ау!

Выразна пачулася:

— Ду-ду, ау!

Хлопчыку зрабілася весела.

З-за дрэва выйшаў дзядуля з поўным кошыкам грыбоў.

— Я тут. Чаго крычыш? Што, страшна?!

— Не, гэта мы гулялі, хто каго перакрычыць.

— А-а! — зразумеў унука дзядуля.

*Паводле Р. Бензерука*

Хто адказваў у лесе Максімку?

Пакажыце, як вы будзеце крычаць, гукаць, калі згубіцеся.



Правообладатель Народная асвета



## Паразмаўляем

**19.** Пакажыце з суседам па парце, як вы будзеце звяртацца з просьбай адзін да аднаго і выказваць падзяку адзін аднаму.

У з о р.

— Калі ласка, ..., дай мне паглядзець тваю кніжку пра грыбы!

— ..., вазьмі, паглядзі. (Прабач мне. Не магу даць табе паглядзець. Гэта не мая кніжка.)

— Дзякуй. (Шкада.)



## Рухальная хвілінка

**20.** Слухайце і выконвайце дзеянні. Разыграйце сцэнку: адзін вучань паказвае, як грыб махавік лезе з зямлі, другі вучань — грыбнік, ён убачыў грыб.

* * *

...Лезе з моху махавік.
Размінае плечы,
ад натугі крэхча —
паспрабуй прабіцца
з гэтакай цямніцы...

А калі прабіўся —
і грыбнік з’явіўся:

— Ну, здароў, махавічок,
казлякоў сваячок!..

*В. Зуёнак*



Правообладатель Народная асвета

## Слоўнік

**Разміна́е пле́чы** — распраўляе плечы.

**21.** Якія грыбы вы ведаеце? Пакажыце і назавіце на малюнку ядомыя грыбы. Пакажыце атрутныя грыбы.



Запішыце назвы грыбоў, якія вы збіралі.

### *Урок 6*

**22.** Разгледзьце малюнак. Прачытайце народную прымету.



Жураўлі ляцяць высока —
зіма яшчэ далёка.

Складзіце і запішыце два-тры сказы пра восень.

Як апранаюцца людзі восенню?

Куды адлятаюць пералётныя птушкі?



Правообладатель Народная асвета

**23.** Прачытайце верш Якуба Коласа.

### Адлёт жураўлёў

Замірае лета,
заціхаюць далі,
сірацее рэчка,
халадзеюць хвалі.

У бязмежным небе
роўненькім шнурочкам
жураўлі ў вырай
мкнуцца над лясочкам.

Які настрой у вас выклікае гэты верш?

Пакажыце, што ў вас сумны настрой. Параўнайце і ацаніце, хто змог лепш перадаць восеньскі настрой.

Пакажыце, як ляцяць жураўлі. Дзеці аднаго рада паказваюць, як жураўлі ляцяць «роўненькім шнурочкам». Дзеці другога рада адзначаюць, ці дакладна паказана дзеянне.

## Слоўнік

**Мкну́цца, імкну́цца** — хутка ляцяць.

**24.** Складзіце сказы і запішыце. У канцы кожнага сказа стаўце кропку.

Узор. *Трактар едзе.*

| **Назвы прадметаў** | **Дзеянні прадметаў** |
|---|---|
| трактар | ляцяць |
| жураўлі | едзе |
| чалавек | плыве |
| качка | ідзе |



Правообладатель Народная асвета

* **25.** Замацуем веды пра дзеянні прадметаў у гульні «Хто ляціць?». Калі прадмет сапраўды можа лятаць, пляскайце ў далоні.

Качка ляціць. Самалёт ляціць. Жаба ляціць. Альвак ляціць. Журавель ляціць. Гусь ляціць. Рыба ляціць. Рак ляціць. Камар ляціць. Кветка ляціць. Пчолка ляціць. Страказа ляціць. Дрэва ляціць.

Запішыце назвы прадметаў, якія не лятаюць. Напішыце, што яны робяць.

Узор. *Жаба скача, ... .*

Словы для даведкі: *цвіце, расце, скача, плыве, піша, паўзе.*

## Урок 7

**26.** Прачытайце тэкст па чарзе (чатыры вучні).

Я вельмі люблю восень. Яна прыгожая. Дрэвы ўвосень стаяць зялёныя, жоўтыя і чырвоныя.

Восень вельмі багатая. У садах выраслі і паспелі яблыкі, грушы, слівы.

На агародзе красуюцца прыгожыя памідоры. Сланечнік падобны да сонца. Ён упрыгожвае агарод.

На полі капаюць моркву, буракі, бульбу. У хуткім часе будуць зразаць капусту.

Чаму восень прыгожая?

Чаму восень багатая?

За што вы любіце восень? Адкажыце пісьмова. Можаце выкарыстаць сказы тэксту.

Калі не любіце восень, напішыце, чаму яна вам не падабаецца.



Правообладатель Народная асвета

**27.** Прачытайце.



**Запрашаю**

Я на дачы працаваў:  
і палоў, і паліваў.  
А сягоння запрашаю  
вас на свята  
ўраджаю.











Гэткай вырасла цыбуля —  
пазайздросціла бабуля.  
І гарох, і боб —  
на дзіва!  
Рэпа слаўная ўрадзіла.  
А якія агуркі!  
Я не еў яшчэ такіх.  
Морква — растае ў роце.  
Пачастую ўсіх –  
прыходзьце!

*М. Пазнякоў*

Хто працаваў на дачы?

Што вырасціў хлопчык? Запішыце назвы агародніны.

Раскажыце, як вы дапамагаеце сваім бацькам, бабулі і дзядулю вырошчваць ураджай.



Правообладатель Народная асвета

**28.** Прачытайце і адгадайце загадку.





Між агуркамі, буракамі
каза з зялёнымі рагамі.

*А. Клышка*



Запішыце загадку разам з адгадкай.

**29.** Запішыце рэцэпт салата: у кожным пункце адно слова. Дайце назву сваёй салаце.

Узор. *Салат «Восеньскі букет».*



*Рэцэпт.*

Для салата спатрэбяцца: 1. ... . 2. ... . 3. ... . 4. ... . 5. Прыправа — ... .

Пакажыце, як вы будзеце рабіць салат.

### *Урок 8*

**30.** Праслухайце.

#### Вавёрка пакрыўдзілася

На дубе вавёрка зрабіла сабе жытло. Хавае яна ў дупле шышкі, арэхі. Вавёрка прывыкла да людзей і не ўцякае.



Правообладатель Народная асвета

Антаніна Сямёнаўна жыве ў горадзе Паставы. Працуе настаўніцай у суседняй вёсцы. Ніколі не палохала Антаніна Сямёнаўна вавёрку. Але аднойчы яна была стомленая і крыкнула на вавёрку. Ціхая і даверлівая вавёрка нейкі момант здзіўлена глядзела на яе. Потым сiганула ў дупло.

Назаўтра настаўніца праходзіла пад дубам. Вавёрка кінула на яе шышку.

«Трэба абхітрыць звярка», — падумала настаўніца.

У наступны дзень яна надзела новую сукенку, павязала новую хустку. Але на галаву зноў упала шышка.

Якая крыўдлівая вавёрка!..

*Паводле У. Шулякоўскага*

Чаму пакрыўдзілася вавёрка?

Назавіце імя і імя па бацьку настаўніцы.

Чаму Антаніна Сямёнаўна крыкнула на вавёрку?

Што вы параіце настаўніцы? Што трэба зрабіць, каб вавёрка перастала крыўдзіцца на яе? (Спяваць, тупаць, ціхенька праходзіць, крычаць.)

Што трэба рабіць вучням, каб настаўніца менш стамлялася?

Спішыце першыя тры сказы тэксту.



## Паразмаўляем

**31.** Прачытайце. Пакажыце ў пары, як вы будзеце прасіць прабачэння.

Узор.

Міша пакрыўдзіў свайго сябра Андрэя. Ён папрасіў у яго прабачэння:



Правообладатель Народная асвета

— Андрэй, прабач мне, калі ласка.
— Нічога, Міша. Больш так не рабі.
— Не буду.



## Рухальная хвілінка

**32.** Адзін вучань чытае верш, клас выконвае дзеянні: усе забіваюць цвік то правай, то левай рукой; дзвюма рукамі вешаюць ручнік.

**Павесім ручнік**

«Стукай-грукай, малаток!» —
напявае Петрусёк.
Ён забіў у сцяну цвік
і павесіў свой ручнік.

Запішыце, што зрабіў Петрусёк.

* **33.** Назавіце прадметы на малюнках і пакажыце, як імі працуюць. Запішыце адказы на пытанні.



Узор. *Сякера сячэ дровы.*

Сякера (што робіць?) ... ... .

Піла (што робіць?) ... ... .

Рыдлёўка (што робіць?) ... ... .

Граблі (што робяць?) ... ... .

Словы для даведкі: *пілуе, сячэ, капае, зграбаюць; дровы, дрэвы, лíсце, грáды.*



Правообладатель Народная асвета

# ТЭКСТ

## *Урок 9*

### Адрозненне тэксту ад сказаў

**34.** Разгледзьце малюнкі. Пакажыце на малюнках белага і чорнага буслоў. Прачытайце сказы над лінейкай, а потым — пад ёй. Дзе сказы звязаны па сэнсе?



1. Ёсць белыя і чорныя буслы. 2. У бабулі на градцы выраслі добрыя агуркі. 3. Белых буслоў нельга ўявіць далёка ад чалавечага жылля. 4. На стале ў салатніцы быў фруктовы салат. 5. Дзе жывуць людзі, там чорныя буслы не сустракаюцца.

---



Чорныя буслы — лясныя птушкі. Гнёзды робяць на ўчастках ліставога і змешанага лесу. Выводзяць двое — пяцёра птушанят. Чорныя буслы кормяцца жабамі, вужамі, дробнай рыбай. Адлятаюць яны ў вырай у канцы жніўня і на пачатку верасня.

*Паводле З. Бяспалага*

З тэксту над лінейкай выпішыце сказы пра буслоў, каб у вас атрымаўся тэкст.

Спішыце тэкст пад лінейкай.



Правообладатель Народная асвета

Раскажыце, што вы даведаліся пра белых і чорных буслоў. Чым яны падобныя, а чым адрозніваюцца?

**Тэкст** — гэта некалькі сказаў, якія звязаны паміж сабой па сэнсе.

*Аглядаю вяршаліну дуба. На дзвюх тоўстых бакавых галінах бачу вялізнае гняздо. Двое чорных бусляня ляжаць у гняздзе.*

*Паводле З. Бяспалага*

**35.** Прачытайце сказы пад нумарам 1. Аб чым гаворыцца ў кожным з іх? Дакажыце, што гэта асобныя сказы і тэксту не складаюць. Потым прачытайце сказы пад нумарам 2. Гэта асобныя сказы ці тэкст? Абгрунтуйце свой адказ.

1. Восенню некаторыя птушкі ляцяць у вырай. Летам доўгі час не было дажджоў. Людзі збіраюць на балоце журавіны. Дзеці прыгожа спяваюць.

2. Учора з раніцы і да самага вечара дажджыла. А сёння зусім па-ліпеньску спякотлівы дзень. І цішыня. Толькі дзесьці звонка цінькаюць сінічкі. Памятаеце такую прыказку: «У верасні сініца ў госці восень запрашае»?

*Паводле У. Ягоўдзіка*

Які ўчора быў дзень? А які дзень сёння? Як можна сказаць пра сённяшні дзень інакш?

Спішыце сказы, у якіх гаворыцца пра надвор'е ўвосень.

Знайдзіце ў тэксце прыказку і прачытайце яе.



Правообладатель Народная асвета



## Хвілінка-весялінка

**36.** Прачытайце.

### Памочнік

Маці ставіла пірог.
Я ёй трошкі дапамог.
Кінуў жменьку я карыцы,
выліў слоічак гарчыцы.
Выпек я пірог на славу!
З'есці ж ні куска не змог.

*Паводле Р. Сефа*

Пакаштуйце гарчыцу, карыцу. Чаму хлопчык не змог з'есці пірог?

**37.** Прачытайце тэкст. Пра што ў ім гаворыцца? Пра каго?

Восень прыходзіць на парог. Шматлікае крылатае войска адлятае ў вырай.

Першымі ў заморскія краіны адлятаюць стрыжы і ластаўкі. За імі ў няблізкую дарогу выпраўляюцца пліскі, буслы, шпакі... А ў канцы верасня чуюцца самотныя крыкі жураўлёў.

*Паводле У. Ягоўдзіка*










Правообладатель Народная асвета

## Слоўнік

**Самóтныя** — сумныя.

Каго пісьменнік назваў «шматлікім крылатым войскам»? Адкажыце адным словам.

Пакажыце і назавіце птушак на малюнках.
Які настрой у вас выклікаў гэты тэкст? Чаму?
Спішыце першую частку тэксту.

### *Урок 10*

### Адрозненне тэксту ад сказаў

**38.** Прачытайце сказы.

1. Дзеці ідуць у школу. Хлопчыкі і дзяўчынкі любяць гуляць з мячом. Званок у школе кліча дзяцей на ўрок. У Максіма сястрычка Аленка.

2. Раніцай Волечка ішла ў школу. Каля дарогі рос прыгожы рамонак. Волечка хацела сарваць кветку. Але дзяўчынка ўбачыла на яе пялёстках кропельку расы. Волечка пашкадавала рамонак, не сарвала яго.

*Паводле В. Сухамлінскага*

У якой частцы асобныя сказы, а ў якой — тэкст? Як вы здагадаліся?
Чаму Волечка не сарвала кветку?
Спішыце тэкст.
Паназірайце, якія кветкі растуць каля дарогі. Назавіце іх.

Словы для даведкі: *рамонак, званочкі, канюшына, дзьмухаўцы.*



Правообладатель Народная асвета



## Паразмаўляем

**39.** Разгледзьце кветкі. Назавіце іх і пакажыце на малюнку. Прачытайце пра іх.









Разыграйце размову.

Узор.

— Мы любім усе кветкі. Непрыгожых кветак не бывае. Але больш за ўсё мне падабаецца … .

— А мне падабаецца … .

— Мне падабаюцца … .

Для даведкі.

Ружу называюць царыцай кветак. Яна мае прыемны пах.

Званочак блакітны. Ён заўсёды глядзіць уніз. Быццам пра нешта ўвесь час думае.

Прыгожы сіні васілёк заўсёды расце на жытнім полі і з’яўляецца яго верным спадарожнікам.

Кветкі вяргіні бываюць featureрознага колеру. Вяргіні радуюць вока да позняй восені, да першых маразоў.

Пакажыце, як вы будзеце захапляцца прыгожай кветкай.



Правообладатель Народная асвета

*** 40.** Разгледзьце кубачкі на малюнку. Да кожнага кубка падбярыце сподачкі.



Што дапамагло вам выканаць заданне?

Запішыце назвы кветак. Складзіце з гэтымі словамі сказы. Што ў вас атрымалася: асобныя сказы ці тэкст?

Словы для даведкі: *цюльпан, васілёк, рамонак.*

**41.** Прачытайце верш.

**Хачу**

Хачу без каскі і пагонаў
хадзіць з сябрамі па зямлі,
і каб у чашах палігонаў
жывыя кветкі расцвілі.

*А. Пысін*

Раскажыце пра тое, чаго хоча паэт.

Як вы думаеце, пра што гэты верш? Дадайце да назвы верша словы, якія вам больш падабаюцца.

Для даведкі.

Хачу, каб цвілі кветкі,
каб быў мір на зямлі,
каб ніколі ў свеце не было вайны.

Спішыце верш са сваёй назвай.



Правообладатель Народная асвета

## Урок 11

### Тэма тэксту. Назва тэксту

**42.** Разгледзьце малюнкі. Пакажыце на малюнках Васільку і Барсіка.





Адкажыце на пытанні.

Чаго хоча Барсік?
Што робіць Василька?
Чым Васілька частуе Барсіка?

Складзіце сказы па малюнках.
Запішыце тэкст з назвай «Васілька і Барсік».
Пра каго гаворыцца ў тэксце?

Словы і спалучэнні слоў для даведкі: *шчаня, вада, налівае ваду, частуе косткай.*

**Тэма тэксту** — гэта тое, пра што гаворыцца ў тэксце. Тэма тэксту часта перадаецца ў яго назве.



Правообладатель Народная асвета

* **43**. Разгледзьце малюнкі.







Прачытайце тэкст. Пра што гаворыцца ў ім? Назавіце яго тэму. Дайце назву тэксту.

Назвы для выбару: «Працуем усе разам», «Дружная сям'я», «Будзе чыста — будзе ўтульна».

Сёння субота. Уся сям'я дома. Усе дружна разам працуюць.

Мама і тата ... вокны. Бабуля ... ежу. Дзядуля пыласосам ... дыван. Марыля ... посуд.

Запішыце назву тэксту.
Спішыце тэкст. Устаўце патрэбныя словы.

Словы для даведкі: *мые, гатуе, мыюць, чысціць.*



Правообладатель Народная асвета



## Паразмаўляем

**44.** Папрасіце ў свайго суседа (у сваёй суседкі) каляровы фламастар.

Узор.

— Марыначка, дай мне, калі ласка, чырвоны фламастар.

— Я выканаю практыкаванне, падкрэслю словы, потым дам табе фламастар. Пачакай, калі ласка.

— Дзякуй, я пачакаю.

Разыграйце сцэнку.



## Хвілінка-весялінка

**45.** Прачытайце.

— Дзядзька, якая рыба ў вашай рацэ водзіцца?
— Шчупак, сом, лінь, карась, плотка...
— А ракі ёсць?
— Ёсць. Толькі рак — не рыба.
— Дзядзька, якая рыба самая смачная для вас?
— Каўбаса.

Што з пералічанага — рыба?
А што для вас самае смачнае?

* * *

— Мама, купі марожанае.
— У цябе ж горла забаліць.
— Не забаліць. Марожанае пад языком растане.

Ці купіць маці сыну марожанае? Растлумачце свой адказ.



Правообладатель Народная асвета

## *Урок 12*

### Чырвоны радок у пачатку тэксту. Абзац

**46.** Прачытайце.

**Як Дзяніска восені дапамагае**

Дзяніска любіць восень. Але толькі недажджлівую. Неба сёння высокае, блакітнае. Сонца шчодрае. Восень размалёўвае лісце на дрэвах у жоўты, ружовы, барвовы колеры. У восені шмат работы.

Дзяніска прыгожа малюе восеньскія дрэвы. Так Дзяніска дапамагае восені рабіць лес прыгожым.

*Паводле Т. Мушынскай*

Якую восень любіць Дзяніска?

Якое сёння надвор'е? Якое лісце на дрэвах?

Спішыце другую частку тэксту. Пачынайце пісаць з чырвонага радка.

**Чырвоны радок** (або **абзац**) — гэта водступ управа ў пачатку першага радка тэксту.

**47.** Праслухайце.

Сярожа сядзеў у аўтобусе побач з вадзіцелем. Хлопчык убачыў на дарозе зайца. Ён бег перад самай машынай. Шафёр націснуў на педаль газу. Ён хацеў дагнаць зайца. Сярожу стала невыносна шкада гэтую бяскрыўдную шэранькую істоту.

— Не трэба! — закрычаў хлопчык на ўвесь голас. — Не трэба!



Правообладатель Народная асвета

Машына тузанулася і стала. Шафёр паклаў сваю руку на Сярожавы плечы і сказаў:

— У цябе ёсць цяпер свой заяц у лесе...

*Паводле А. Вольскага*

Дзе сядзеў Сярожа ў аўтобусе?

Каго на дарозе ўбачыў хлопчык?

Што хацеў зрабіць вадзіцель?

Чаму ў Сярожы ёсць цяпер свой заяц у лесе? Выберыце адказ.

1. Сярожа выратаваў зайца. 2. Заяц абавязаны Сярожу жыццём. 3. Сярожа не пакрыўдзіў зайца.

Выпішыце з тэксту сказ, у якім гаворыцца, што Сярожа пашкадаваў зайца. Не забывайцеся пісаць з чырвонага радка.



## Паразмаўляем

**48.** Назбірайце прыгожага лісця, складзіце з іх букет або намалюйце восеньскі пейзаж. Падарыце букет ці малюнак сваёй бабулі або свайму дзядулю (маме, тату, брацiку, сястрычцы).

Пакажыце, як вы будзеце яго дарыць. Якія словы будзеце гаварыць?

Узор.

— Тата, ты нарадзіўся восенню. Я віншую цябе. Жадаю табе больш адпачываць. Мы цябе вельмі любім. Прымі ад усіх нас гэты восеньскі букецік.

— Вялікі дзякуй, сынок!



Правообладатель Народная асвета



## Рухальная хвілінка

* **49.** Гульня «Мы ма́сленічную рэдзьку сеялі».

Мы перакопвалі зямельку вось так, вось так.
Мы на зямельку насенне сыпалі вось так, вось так.
Наша рэдзька вырастала вось так, вось так.

Навошта сеюць ма́сленічную рэдзьку? Даведайцеся ў бацькоў і раскажыце ў класе.

## *Урок 13*

### Узнаўленне дэфармаванага тэксту

**50.** Прачытайце. Перастаўце сказы, каб атрымаўся тэкст. Запішыце тэкст.

Там будуць здымаць яблыкі і грушы з дрэў. Сёння бацькі і дзеці рыхтуюцца да паездкі. У суботу яны паедуць на дачу. Ураджай у гэтым годзе вялікі.



## Паразмаўляем

**51.** Выкажыце просьбу. Папрасіце ветліва прабачэння.

Узор.
Мама просіць:
— Калі ласка, дзеці, не шуміце. Тата працуе.
— Прабачце нам. Мы будзем ціха гуляць.

* * *

Бабуля кажа:
— Міша, ты вельмі гучна размаўляеш па тэлефоне. Галя робіць урокі.
— Прабач, бабуля, я буду гаварыць цішэй.



Правообладатель Народная асвета

*** 52.** Прачытайце сказы. Разгледзьце малюнкі. Выправіце паслядоўнасць сказаў па малюнках.

Аленка робіць зарадку. Аленка ўмываецца. Аленка засцілае ложак. Дзяўчынка ідзе ў школу. Аленка снедае. Дзяўчынка адзяваецца.








Запішыце сказы. Ці атрымаўся ў вас тэкст?

Словы і спалучэнні слоў для даведкі: *засцілае ложак, умываецца, ідзе ў школу, робіць зарадку, адзяваецца, снедае.*



Правообладатель Народная асвета

**53.** Узнавіце тэкст пры дапамозе малюнкаў і слоў для даведак.










Рабочы працуе на … . Трактарыст працуе ў … . Хлопчык вучыцца ў … . Урач лечыць у … .

Словы для даведкі: *кабінеце, заводзе, полі, школе.*



## Хвілінка-весялінка

**54.** Прачытайце. Адкажыце на пытанне Юры.

Юра пытаецца ў свайго сябра:

— Антось, ты ведаеш, чаму ў зайца вушы доўгія?

— Ведаю. Калі заяц быў маленькі, ён не слухаўся свайго тату.

Як вы думаеце, Антось жартаваў ці адказваў свайму сябру сур’ёзна?



Правообладатель Народная асвета

Выберыце адказ, які вам больш падабаецца, або прыдумайце свой.

1. Зайчык слухаў сваю маці. Ён усяму хацеў навучыцца ў яе. Таму ў яго выраслі доўгія вушы.
2. Маленькаму зайчыку падабаліся высокія кусты, дрэвы. Ён марыў аб доўгіх вушах. З доўгімі вушамі ён будзе высокі. Заяц выцягнуў доўгія вушы.
3. Зайцу ўвесь час трэба прыслухоўвацца. У лесе яго можа з'есці хітрая лісіца або шэры зубасты воўк.

## *Урок 14*

### Падзел тэксту на сказы

**55.** Прачытайце. Падзяліце на сказы. Колькі ў вас атрымалася сказаў? Запішыце пяць сказаў.

Наша кошка Мурка чорненькая лапкі ў яе беленькія раніцай Мурка ўмываецца старанна, чысценька ў Муркі ёсць дружок яго завуць Пушок ён беленькі носік і вушкі ў яго чорныя Мурка і Пушок любяць гуляць на двары

**56.** Гульня «Кот вялікі і малы». Настаўнік паказвае малюнак вялікага і малога ката. Дзеці называюць, хто гэта і што ў іх. Потым гавораць словы з памяншальна-ласкальным адценнем.

У ката лапы, у коціка — ... (лапкі).
У ката вочы, у коціка — ... (вочкі).
У ката вушы, у коціка — ... (вушкі).
У ката вусы, у коціка — ... (вусікі).

Дайце кату і коціку мянушкі. Складзіце і запішыце сказы пра іх, каб у вас атрымаўся тэкст.

Словы для даведкі: *Пушок, Мурлыка*.



Правообладатель Народная асвета

**57.** Праслухайце.

Жыў-быў мудры чалавек. Была ў яго дачка. Жылі яны ў прыгожым, вялікім доме. Каля дома быў сад з кветкамі. З раніцы да вечара дзяўчынка гуляла ў садзе ці бегала па пакоях дома. Толькі адзін пакой заўсёды быў зачынены.

Дачка вырасла і ўпрасіла мудраца зазірнуць у той пакой. У пакоі дзяўчынка ўбачыла прасніцу, верацяно і раскрытую кнігу. Дзяўчынка здзівілася і спытала бацьку:

— А што тут самае лепшае?

— Гэта і ёсць самае лепшае. Прасніца і верацяно — гэта праца. Кніга — вучэнне. Усё добрае на свеце дасягаецца працай і ведамі.

*Паводле балгарскай народнай казкі*





Раскажыце казку па пытаннях.
Дзе жылі мудры чалавек і яго дачка?
Што рабіла дзяўчынка ўвесь дзень?
Што знаходзілася ў зачыненым пакоі?
Што абазначалі гэтыя рэчы?

Спішыце апошні сказ тэксту. Запомніце яго на ўсё жыццё.

**58.** Прачытайце.

Бабуля варыць суп унучка Соня дапамагае ёй Соня абірае бульбу і чысціць моркву бабуля рэжа бульбу і



Правообладатель Народная асвета

моркву і кладзе ў каструлю з вадой бульба і морква хутка зварацца бабуля соліць і кладзе ў суп прыправу ўнучка насыпае ў каструлю макароны смачны суп будзе ў бабкі і ўнучкі.

Дайце назву тэксту.

Падзяліце на сказы. Запішыце сказы пра дзеянні ўнучкі.

### *Урок 15*

## Сувязь сказаў у тэксце

**59.** Прачытайце. У другім, трэцім і чацвёртым сказах замяніце імя *Захарка* на словы *хлопчык* і *ён*.

Захарка жыве ў вялікім шматпавярховым доме. Захарка раніцай ходзіць у школу. Захарка вучыцца старанна. Захарка за гэты тыдзень атрымаў тры добрыя адзнакі.

Запішыце зменены тэкст.



## Паразмаўляем

**60.** Вы не можаце знайсці свой сшытак. Спытайце пра яго ў школьнага таварыша.

Узор.

— Юра, я кудысьці паклаў свой сшытак. Ты яго не бачыў?

— Вось твой сшытак.

— Вялікі дзякуй.

— Калі ласка.



Правообладатель Народная асвета

**61.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце тэкст.



### Апельсін

Мама купіла апельсін. Мама (яна) прыйшла з работы і аддала апельсін (яго) сваёй старэнькай маці. Старэнькая маці (бабуля) аддала апельсін унуку Васілю. Унук Васіль (ён) аддаў апельсін маме. Мама (яна) падзякавала сыну. Яна (мама) падзяліла апельсін на ... часткі. Усе пакаштавалі апельсін. Апельсін (ён) быў удвая смачнейшы.

На колькі частак мама падзяліла апельсін?

Чаму апельсін быў смачнейшы ўдвая?

Запішыце тэкст, замяняючы некаторыя словы словамі з дужак. Прачытайце.

Колькі чалавек у вашай сям'і? Як вы падзеліце апельсін?



## Хвілінка-весялінка

**62.** Прачытайце.

Маці пытаецца ў сына:

— Андрэйка, чаму ты запрасіў на дзень нараджэння толькі Косцю і Жэню?



Правообладатель Народная асвета

Андрэйка адказвае маці:
— Бо толькі яны не любяць торт і пячэнне.

Што вы можаце сказаць пра Андрэйку?

А каго вы запрашаеце на свой дзень нараджэння? Што яны любяць?

**63.** Прачытайце сказы. Вызначыце парадак дзеянняў і зрабіце інсцэніроўку.

Раптам яны пачулі ў кустах шум.
Міша кінуўся ўцякаць.
Андрэй і Міша ішлі па лесе.
Андрэй зазірнуў пад кусты і выцягнуў маленькае птушаня.

Выберыце загаловак тэксту: «Птушаня напалохала», «Выпадак у лесе», «Смелы Андрэйка».

Запішыце сказы ў правільным парадку, каб атрымаўся тэкст.

## *Урок 16*

### Сувязь сказаў у тэксце

**64.** Прачытайце тэкст.

Ляснік ішоў па лесе. Ён убачыў дупло. У дупле была маленькая вавёрка. Ляснік прынёс яе дамоў. Карміў звярка, даглядаў.

Вавёрка вырасла і збегла ў лес.

Колькі частак у тэксце? Спішыце першую частку тэксту. У другім сказе падкрэсліце слова, якое замяняе слова *ляснік*.



Правообладатель Народная асвета

**65.** Прачытайце.

## Белавежская пушча

У Белавежскай пушчы жывуць зубры. Гэта магутныя звяры. Зубр мае вялікую сілу. Ён можа паваліць рагамі дрэва. Але гэта рахманы і добры звер.

*Паводле У. Караткевіча*



Разгледзьце малюнак. Які зубр па велічыні і сіле? (Моцны, малы, дужы, вялікі.)

Запішыце тэкст.



## Паразмаўляем

**66.** Разыграйце размову ў пары.

Узор.

Міша спытаў:
— Ягор, ты быў у Белавежскай пушчы?
— Так. Мы ездзілі на экскурсію з класам.
— Што табе больш за ўсяго спадабалася?
— Вялікі і прыгожы лес.
— А зуброў ты бачыў?
— Бачыў. Гэта вельмі магутныя звяры.
— А я яшчэ не бачыў.
— З’ездзі на экскурсію. Не пашкадуеш.
— Дзякуй за параду.

Што вам падабаецца ў Белавежскай пушчы?



Правообладатель Народная асвета

**67.** Прачытайце верш. Назавіце яго тэму.

### Вартавыя прыроды




Каб на кнігі мецць паперу,
лесу шмат ідзе без меры.
— А ці вам, сябры, вядома,
як мы лес ратуем дома?..

Мы — прыроды вартавыя.
Нам заўжды дапамагай —
кніжкі ўсе свае старыя
не выкідвай, а збірай...

*Л. Дайнека*

Разгледзьце малюнак.
Што робяць дзеці?
Які подпіс на кантэйнеры?
Як можна ратаваць лес дома?
Як гэта робяць у вашай сям'і?
Раскажыце, як людзі ратуюць лес.



### Рухальная хвілінка

* **68.** Пакажыце жывёл з дапамогай мімікі, жэстаў, рухаў або пальчыкавай гімнастыкі: лісіцу, вавёрку, мядзведзя, аленя, вожыка.

Запішыце назвы жывёл, якіх вы пазналі.



Правообладатель Народная асвета

## Урок 17

### Пераказ тэксту па пытаннях і па дадзеным плане

* **69.** Праслухайце тэкст.

**Бярозка**

З-пад мосціка ў шчыліне паміж дошкамі вырасла бярозка. Яна прагна цягнулася да сонца і шапацела зялёным лісцейкам.

Людзі шкадавалі яе. Шафёры і трактарысты баяліся зачапіць дрэўца. Але кожны раз хлопчык падыходзіў да мосціка з трывогай у сэрцы. Бачыў бярозку — супакойваўся і радаваўся. Аднойчы ён узяў рыдлёўку, выкапаў бярозку і пасадзіў яе каля дарогі.

Цяпер яна ўжо вялікая.

*Паводле М. Янчанкі*

Адкажыце на пытанні пісьмова.

1. Дзе вырасла бярозка?
2. Як ставіліся да яе людзі?
3. Што аднойчы зрабіў хлопчык?
4. Якая зараз бярозка?

**70.** Прачытайце.

**Мая буслiная сям'я**

Тата прымацаваў на хляве старое кола. Яго заўважылі буслы. Яны абсталявалі на ім сваё жытло.

Ой, як я люблю гэтых паважных, грацыёзных птушак! Буслы мяне таксама любяць. Яны мяне зусім не баяцца.



Правообладатель Народная асвета

Сёлета мая буслiная сям'я павялiчылася ў тры разы. Вывелася ажно чатыры птушаняты! Бусел-тата i бусліха-мама не маюць нiводнай хвiлiнкi для адпачынку. Ім трэба даглядаць дзяцей.

*Паводле І. Муравейкі*

Перакажыце тэкст па наступным плане.

1. Жытло буслоў.
2. Мы з бусламі любім адзін аднаго.
3. Буслiная сям'я павялiчылася ў тры разы.
4. Буслiныя бацькi не маюць часу для адпачынку.

Запішыце сказы да трэцяга і чацвёртага пунктаў плана.



## Хвілінка-весялінка

**70.** Прачытайце.

У лодцы сядзіць дзед Архіп і яго кот Варкот. Дзед закідвае вуду і прыгаворвае:

— Лавіся, рыбка, вялікая і маленькая!

А Варкот ціхенька папраўляе:

— Маленькая лавіся, толькі маленькая!

Чаму кот хоча, каб лавілася толькі маленькая рыба?



## Паразмаўляем

**71.** Разыграйце сцэнку. Пасварыліся і памірыліся. Пакажыце, як вы будзеце мірыцца і прасіць прабачэння.

— Даруй мне, Васілька, твая праўда.
— Дарую, Міша.
— Не крыўдуй на мяне, Васілька, давай мірыцца.
— Я не крыўдую, Міша, давай гуляць.



Правообладатель Народная асвета

## *Урок 18*

### Калектыўнае складанне невялікага тэксту

**72.** Складзіце разам невялікі тэкст пра Таню.

Што Таня рабіла на лузе? (Збірала кветкі.) Якія кветкі яна збірала? (Рамонкі, званочкі, васількі.) Што яна хацела з імі зрабіць? (Занесці бабулі ці маме, паставіць у вазу.)

Адкажыце на пытанні пісьмова.

**73.** Складзіце невялікі тэкст пра хлопчыкаў, якія хадзілі з татам у лес. Дайце дзецям імёны.

Пачнём сваё апавяданне так: Васілька і Дзяніска ў нядзелю хадзілі з татам у лес...

Каго хлопчыкі ўбачылі ў лесе? (Маленькую спрытную вавёрку, зайчыка, лісу.)

Якія грыбы раслі на невялікім пяньку? (Баравікі, апенькі.)

Якімі дзеці вярнуліся дамоў? (Стомленымі і задаволенымі.)

Запішыце свой тэкст.



### Хвілінка-весялінка

**74.** Прачытайце.

— Настаўніца казала, што ты заснуў на ўроку спеваў. Як жа гэта? — пытаецца мама ў Сяргейкі.

— А што ж мне было рабіць, калі ўвесь клас заспяваў калыханку? — адказаў Сяргейка.

Якім быў Сяргейка? (Знаходлівым, цікаўным, лянаватым, жартаўлівым.)



Правообладатель Народная асвета



## Рухальная хвілінка

**75.** Паслухайце. Вывучыце ўсе разам верш «Грушка».

Мы пасадзім грушку
ўсе, усе.
Няхай наша грушка
расце, расце.

Вырасці ты, грушка,
вось такой вышыні.
Распусціся, грушка,
вось такой шырыні.

Цяпер выберыце «грушку».

«Грушка» становіцца ў сярэдзіне круга. Астатнія дзеці ходзяць у карагодзе і рухамі паказваюць тое, пра што гаворыцца ў вершы.

**76.** Прачытайце.

Нашы продкі пачалі вырошчваць лён вельмі даўно.

Што яны выраблялі з ільну? (Ніткі, вяроўкі, рыбалоўныя сеткі, адзенне, алей.)

Лён адзяваў і карміў людзей. Таму яны называлі расліну ласкава: лянок, ляночак.

*Паводле З. Марозава*

Што ёсць у вас дома з ільну?
Складзіце і запішыце тэкст з трох сказаў пра лён.



Правообладатель Народная асвета

# СКАЗ

## *Урок 19*

### Сказ як адзінка маўлення

**77.** Разгледзьце малюнкі. Вусна апішыце малюнкі злева і справа. Параўнайце іх. Што абазначаюць словы? Што выражаюць сказы?

Узор.

 — *груша.*



*Юля рве спелую грушу.*

 — ... .



... ... ... ... .

Па дадзеным узоры складзіце і запішыце сказ пра кветкі.

Словы абазначаюць прадметы, іх прыметы і дзеянні: *восень, халодны, ісці.*

Сказы перадаюць закончаную думку: *Восенню ідзе халодны дождж.*

Усе словы ў сказе звязаны паміж сабой па сэнсе: *Сонца ўвосень свеціць, ды не грэе.*



Правообладатель Народная асвета

**78.** Прачытайце. Дапоўніце сказы.

Каля будкі сядзіць … .
… сядзіць на галінцы дрэва.
… ляціць высока.
На пліце кіпіць … .
Дзяўчынка прасуе … .

Запішыце сказы.

Словы для даведкі: *сабачка, самалёт, спадніцу, чайнік, птушка.*

**79.** Прачытайце словы і сказы. Параўнайце іх. Што абазначаюць словы? Што абазначаюць сказы? Прачытайце пры неабходнасці яшчэ раз правіла на старонцы 47.

Узор.

Восень, ісці, доўгія і халодныя, дажджы. — Восенню ідуць доўгія і халодныя дажджы.

Сад, яблыкі, слівы, выраслі, жоўтыя, сінія. — У садзе выраслі жоўтыя яблыкі, сінія слівы.

Агарод, памідоры, агуркі, чырвоныя, зялёныя, выраслі. — На агародзе выраслі чырвоныя памідоры і зялёныя агуркі.



## Хвілінка-весялінка

**80.** Прачытайце беларускі народны жарт.

— Вось у нас капуста расла! — кажа адзін чалавек. — Качаны пуды на тры.

— А вось у нас гаршкі лепяць, як бочкі, — гаворыць другі чалавек.



Правообладатель Народная асвета

— А навошта такія вялікія гаршкі? — здзіўляецца першы.

— Капусту варыць, якая ў вас вырасла.

Чаму так адказаў другі чалавек? Як вы адкажаце?

Адказы для выбару. *Каб суп зварыць на месяц. Каб тваю капусту заквасіць. Каб людзей здзівіць.*

## *Урок 20*

### Вычляненне сказа з тэксту

**81.** Прачытайце.

### Цяжкая праца

Я сустрэў у лесе вожыка. Ён нясе тры лісточкі. Два з бакоў, адзін на загрыўку.

Прыйшоў вожык да свайго дома. Трэба лісточкі зняць, пакласці ў нару. Пачаў вожык аб корань церціся. З бакоў зняў. А вось з загрыўка не здолеў, стаміўся. І пайшоў вожык назад па сцяжынцы.

Вожык знік. Я прынёс лісце, паклаў яго ў нару. Дапамог вожыку. Цяжкая ў яго праца!

*Паводле Э. Шыма*

Чаму апавяданне так называецца?

Разгледзьце малюнак. Раскажыце і пакажыце, як вожык нёс лісточкі і як іх здымаў.



Спішыце сказы, якія сведчаць пра добрае і спагадлівае сэрца пісьменніка. Колькі сказаў вы спісалі?



Правообладатель Народная асвета

**82.** Праслухайце. Разгледзьце малюнкі. Падбярыце кожнаму зверу яго хвост.






Раней звяры і жывёлы не мелі хвастоў. Толькі звярыны цар леў быў з хвастом. Леў выдаў загад. Няхай звяры ідуць да яго хвасты сабе падбіраць.

Першай прыбегла лісіца і выбрала сабе самы прыгожы, пушысты хвост. (Пакажыце.)

За лісіцай прыскакала вавёрка. Таксама выбрала сабе прыгожы хвост. Хоць і меншы, чым у лісіцы. (Знайдзіце хвост вавёркі.)

Конь узяў хвост з аднае валасні. Будзе сваім хвастом мух біць. (Знайдзіце і пакажыце.)



Правообладатель Народная асвета

Апошні прыбег заяц. Яму застаўся толькі адзін маленькі хвосцік.

*З народнай казкі*
*«Чаму барсук і лісіца ў норах жывуць»*

Якая жывёла вам падабаецца больш за ўсіх? Запішыце сказы пра яе.



## Рухальная хвілінка

**83.** Размяркуйце ролі і пакажыце маленькі спектакль.



* * *

У куце сядзіць мядзведзь,
хустку вышывае.
А лісічка-невялічка
хатку прыбірае.
А каток пячэ аладкі,
маслам палівае.
Мышанятка жвава, гладка
кату памагае. *У. Луцэвіч*







Запішыце дзеянне, якое вас больш уразіла, здзівіла.



Правообладатель Народная асвета

**84.** Прачытайце і адгадайце загадкі. Вам дапамогуць малюнкі.

1. Малы ён, часам з кулак. Але ў рукі не возьмеш ніяк.
2. Не згубіла, а ўсё шукае. Не хворая, а ўсё крэхча.
3. Сваё дзіця не забыла і чужых малаком напаіла.







Запішыце другую загадку разам з адгадкай. Колькі ў загадцы сказаў?

Пакажыце, як свіння шукае жалуды ды ўсё крэхча.

## *Урок 21*

### Вычляненне сказа з тэксту

**85.** Прачытайце. Як называецца наша Радзіма?

Беларусь — наша Радзіма. Гэта вельмі прыгожы край. У Беларусі ёсць шмат вялікіх і маленькіх гарадоў. Многа глыбокіх і мелкаводных рэк і крыштальных блакітных азёр.

А найбольш наш край славіцца лясамі. Лясоў у нашай краіне шмат, і яны вельмі вялікія. У іх водзяцца розныя звяры, растуць грыбы і ягады.

Які наш край?

Выпішыце сказ, у якім гаворыцца, чым найбольш славіцца наш край.

Складзіце і запішыце тры сказы пра звяроў, пра грыбы. Вам дапамогуць практыкаванні 21, 82.



Правообладатель Народная асвета

**86.** Прачытайце. Калі вы былі ў Мінску, раскажыце пра горад Мінск.

Самы вялікі горад у Беларусі — Мінск. Гэта сталіца Беларусі.

Праз увесь горад цячэ рака Свіслач. Недалёка ад горада знаходзіцца Мінскае мора. Але яно штучнае. Яго выкапалі людзі.

Спішыце тры першыя сказы пра горад Мінск.

**87.** Прачытайце.

Самае вялікае возера Беларусі — Нарач. Яго называюць Беларускім морам.

Возера Нарач вялікае і глыбокае. Яно не зарастае раслінамі. Вада ў ім чыстая, празрыстая, багатая на кісларод.

З возера выцякае рэчка Нарач. Мясцовыя жыхары называюць яе Нарачанкай.

*Паводле В. Вольскага*

Чаму возера Нарач называюць Беларускім морам? Выпішыце з тэксту сказы, у якіх ёсць адказ на гэта пытанне.

**88.** Прачытайце прыказкі.

1. Для ўсякай птушкі сваё гняздо міла.
2. Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы.
3. Нашы сябры — па ўсёй зямлі.

У якіх прыказках гаворыцца пра любоў да Радзімы? А ў якой — пра любоў да міру, пра сяброўства?

Выпішыце прыказку, якая вам больш спадабалася.



Правообладатель Народная асвета

**89.** Праслухайце.



### Зямля з блакітнымі вачамі

Зямля з блакітнымі вачамі —
раздолле рэчак і лугоў!
Тут называюць Васількамі
На Беларусі хлапчукоў.

Звіняць крыніцы, як цымбалы.
Сцяжынкі свецяць у лясах.
Палі, узгоркі, перавалы —
прасторны шлях, далёкі шлях!..

*Э. Агняцвет*

Чаму верш мае такую назву?

Якое імя для хлопчыкаў на Беларусі вельмі распаўсюджана?

Як называецца беларускі музычны інструмент?

Запішыце адказ на другое і трэцяе пытанне.

## *Урок 22*

### Вычляненне сказа з тэксту

**90.** Прачытайце тэкст паводле В. Ластоўскага.

Хто мы? Мы — беларусы. Чаму мы называемся беларусамі? Мы нарадзіліся на беларускай зямлі і жывём на Беларусі. Нашы прадзеды, дзяды і бацькі былі беларусамі.

Чаму мы называемся беларусамі? Выпішыце з тэксту сказы, што адказваюць на гэта пытанне.



Правообладатель Народная асвета

Першае слова ў сказе пішацца з вялікай літары. У канцы сказа ставіцца кропка. *Прыгожа малюе Аленка.*

**91.** Праслухайце тэкст пра паходжанне назвы горада Мінска.

Некалі на беразе Свіслачы пасяліўся асілак. Звалі яго Менеск ці Менскі. У яго млыне малолася мука не з жыта, а з камення. Раз'язджаў Менеск па селішчах і набіраў дружыну з мужных, смелых, дужых людзей, бо муку малоць з каменняў — не мёд есці. З тых людзей утварыўся пазней цэлы горад. Горад каля млына назвалі імем асілка — Менск. Цяпер гэта Мінск, сталіца нашай Беларусі, горад-герой.

*Паводле У. Ліпскага*

## Слоўнік

**Асі́лак** — волат, велікан.

Раскажыце, чаму сталіца нашай краіны мае назву Мінск.

Даведайцеся пра паходжанне назвы горада, вёскі, дзе вы жывяце. Запішыце.

Спытайце ў сваіх бацькоў, кім былі, дзе працавалі вашы дзядулі і бабулі, а таксама іх бацькі.

Напішыце некалькі сказаў пра сваіх бабуль і дзядуль. Раскажыце ў класе ўсім дзецям.



Правообладатель Народная асвета

**92.** Прачытайце.

### Беларускія краявіды

...Гэта наша
зямля дарагая.
Гэта нашы
лугі і палі,
над якімі
спрадвеку лунае
бусел — сімвал
бяссмерця зямлі.

*А. Грачанікаў*

## Слоўнік

**Краяві́ды** — малюнкі прыроды якой-небудзь мясцовасці.

Якія краявіды ты бачыш, ідучы ў школу і са школы? (Прыгожыя дрэвы, луг, поле, кветкі, рэчку...)

Прачытайце верш з пачуццём любві да сваёй зямлі, да свайго краю.

Пакажыце, як бусел лунае — плаўна лятае ў паветры над нашымі лугамі і палямі.

Праслухайце, якое народнае павер’е існуе на нашай Радзіме пра буслоў.

### Буслы прыносяць шчасце

Буслы прыносяць людзям шчасце. Буслы будуюць гнёзды на дрэвах і на хатах. У людзей нараджаюцца дзеці. На гэтай зямлі заўсёды будуць дзеці і гнёзды.

Буслы з’яўляюцца сімвалам бяссмерця зямлі. Нашу краіну называюць зямлёй пад белымі крыламі.

Запішыце першую частку павер’я пра буслоў. Раскажыце бацькам пра буслоў.



Правообладатель Народная асвета

**93.** Прачытайце тэкст паводле В. Ластоўскага.

У свеце шмат розных моў. Усе мовы прыгожыя. Усе любяць сваю родную мову. Кожны чалавек павінен ведаць і ўмець размаўляць на сваёй роднай мове.

Наша родная мова — беларуская. Яна вельмі напеўная, мілагучная і прыгожая.

Выпішыце з тэксту сказ аб тым, што павінен ведаць і ўмець кожны чалавек.

Як вы ставіцеся да сваёй роднай мовы? Ці лічыце яе прыгожай, мілагучнай?

Якія вершы і песні на беларускай мове вы ведаеце? Паслухайце верш ці песню ў выкананні кожнага вучня.

**94.** Прачытайце. Спішыце апошні сказ верша.

* * *

Мова родная, мая ты,
што і дзедавай была!
Мова мамы, мова таты,
мова нашага сяла!

Ты звініш, калі я ўранку
чую песні за акном.
І журчыш ты, як баіць байку
мне бабуля перад сном.
...Мілагучная заўсёды,
як лісточак залаты!

*Н. Гілевіч*

З чым параўноўваецца наша мова? Чаму? Выкажыце сваю думку пра родную мову. Чаму яна дарагая беларусам, як золата?



Правообладатель Народная асвета



## Паразмаўляем

**95.** Паслухайце, як гучаць словы вітання ў розных народаў.

| | |
|---|---|
| Беларусы вітаюць: | «Добры дзень!» |
| Рускія гавораць: | «Здравствуйте!» |
| Украінцы кажуць: | «Добридень!» |
| Малдаване: | «Норок!» |
| Літоўцы: | «Лаба дэна!» |
| Латышы: | «Свэйки!» |
| Англічане і амерыканцы: | «Гуд дэй!» |
| Немцы: | «Гутэн таг!» |

Пакажыце ў пары, як вы будзеце вітаць адзін аднаго на розных мовах.

### *Урок 23*

## Вызначэнне, пра што або пра каго гаворыцца ў сказе

**96.** Прачытайце сказы. Пра што гаворыцца ў сказах? Якая стаіць пара года?

Луг ужо скошаны. Пуста і нудна на полі. Не чуваць гаворкі вецярка з каласкамі збожжа. Сонца не свеціць так ярка, як улетку. Неба ўсё часцей і часцей засцілаюць хмары. Дробны дождж сее, як скрозь сіта.

*Паводле Якуба Коласа*

Спішыце тры першыя сказы.



Правообладатель Народная асвета

*Вучымся чытаць з правільнай інтанацыяй.*

Пры вымаўленні некаторых сказаў голас можа спачатку павышацца, а пад канец сказа паніжацца. Тады ў канцы сказа ставіцца кропка. *На зямлю сонца пасылае свае прамяні.*

**97.** Прачытайце. Дапоўніце словы. Колькі слоў у кожным сказе?

Дзяўчынка вышывае ... .
Бабуля вяжа ... .
Косцік гуляе з ... .

Спішыце сказы. Устаўце словы. Не забывайцеся ў канцы сказа ставіць кропку.

Словы для даведкі: *рукавічкі, брацікам, кветкі.*



## Паразмаўляем

**98.** Пакажыце ў пары, як вы будзеце знаёміцца і расказваць пра сябе.

Узор.

— Як цябе завуць?
— Алена (Сяргей). А цябе?
— А мяне Надзейка (Мікіта).
— У якім класе ты вучышся?
— Я вучуся ў чацвёртым класе. А гэта мая сяброўка (мой сябар) Вераніка (Арцём).
— Вельмі прыемна.

Не забывайцеся падысці блізка, гаварыць з усмешкай, глядзець у вочы субяседніка.



Правообладатель Народная асвета

**99.** Прачытайце сказы. Пра каго і пра што гаворыцца ў кожным сказе?

1. Арцём і Артур гуляюць з мячом. 2. Света палівае хатнія кветкі. 3. Сяргей хоча быць хакеістам.

Спішыце сказы. Нумары прапусціце. У канцы кожнага сказа стаўце кропку.

## *Урок 24*

### Вызначэнне, пра што або пра каго гаворыцца ў сказе

**100.** Разгледзьце малюнкі. Адкажыце на пытанні пад малюнкамі.





1. Хто носіць спадніцы, шорты і штаны?
2. Хто носіць толькі штаны і шорты?

Дзяўчынкі запісваюць першае пытанне і адказ на яго. Хлопчыкі запісваюць другое пытанне і адказ на яго.



Правообладатель Народная асвета

*Вучымся чытаць з правільнай інтанацыяй.*

У сказах, дзе аб нечым пытаюцца, у канцы ставіцца пытальнік. Пры вымаўленні такіх сказаў голас у канцы павышаецца.

— *Як цябе завуць?*

— *Мяне завуць Андрэй.*

**101.** Разгледзьце малюнкі. Адкажыце на пытанні пад малюнкамі.



З кім гуляе Міша?
Каго корміць Зося?
Каму налівае малако Зіна?

Запішыце адно пытанне і адказ на яго (па выбары).



## Паразмаўляем

**102.** Раскажыце пра сябе.

Узор.

— *Як цябе завуць?*

— *Галіна.*



Правообладатель Народная асвета

*— Дзе ты жывеш?*
*— Я жыву ў ... .*
*— У якім класе ты вучышся?*
*— У чацвёртым.*
*— З кім ты сябруеш?*
*— Я сябрую з ... .*
*— Які твой любімы занятак?*
*— Я люблю ... .*

**103.** Запішыце адказы на пытанні.

Якія буракі па колеры і па форме? —
Якая морква па колеры, па форме і па смаку? —
Якая капуста па колеры і па велічыні? —

Словы для даведкі: *вялікая, зялёная, прадаўгаватая, салодкая, круглыя, аранжавая, бардовыя.*

## *Урок 25*

### Вызначэнне, пра што або пра каго гаворыцца ў сказе

**104.** Прачытайце верш з правільнай інтанацыяй. Кожны вучань чытае адзін слупок.

Сябравалі змалку ўтрох
Лёша, Яша і Цімох.
Праўда ў прымаўцы гучыць:
іх вадою не разліць!

Пройдзе лета. Прыйдзе час —
пойдуць дзеці разам у клас.
Толькі як рашыць задачу?
Кожны хлопчык ледзь не плача...



Правообладатель Народная асвета

Калі сядуць Лёша з Яшам,
што Цімох пра гэта скажа?
А з Цімохам сядзе Яша,
Лёша што пра гэта скажа?

Не сумуйце, дружбакі!
Верце, гэты час настане,
калі ўвесь ваш клас такім,
як вы самі, дружным стане!

*Паводле А. Грачанікава*

Хто сябраваў змалку? Выпішыце з верша прымаўку пра сяброўства хлопчыкаў.

Якую задачу ніяк не маглі рашыць хлопчыкі, ідучы ў школу? Што параіў ім паэт? Чаму ён раіць хлопчыкам не сумаваць? Якім стане іх клас у хуткім часе?

*Вучымся чытаць з правільнай інтанацыяй.*

У некаторых сказах выказваецца просьба, пажаданне, загад. *Васіль, прынясі, калі ласка, кнігу.*

У сказах могуць перадавацца розныя пачуцці: радасць, здзіўленне, захапленне і іншыя. Такія сказы чытаюцца з моцным пачуццём. У канцы такіх сказаў ставіцца клічнік. *Які ў цябе прыгожы ранец!*



## Паразмаўляем

**105.** Прачытайце размову. Разыграйце размову ў пары.

— Дзе ты быў у суботу?
— У бабулі.
— Чым яна цябе частавала?
— Пірагом.



Правообладатель Народная асвета

— Пірог быў смачны?
— Вельмі смачны.
— З чым быў пірог?
— З варэннем.
— З якім?
— Вішнёвым (грушавым).

**106.** Прачытайце тэкст па ролях. Спішыце тры першыя сказы.

**Цукеркі**

Мама купіла цукеркі і паклала ў шафу. Вечарам мама дастала цукеркі. Іх засталася толькі палова.

— Хто браў цукеркі? — спытала мама.

— Я не брала, — сказала Аленка.

— І я не браў. — Апусціў вочы Сяргейка.

Маці сказала Сяргейку:

Калі не браў, то скажы: «Чэснае слова».

Сяргейка пасоп носам, пераступіў з нагі на нагу:

— Няхай лепш Аленка скажа.

— Усё зразумела, — усміхнулася маці, — дрэнна, калі лазяць у шафу без дазволу.

Сяргейка аж падскочыў:

— А я спытаў бы, ды не было нікога дома. Чэснае слова, не было!

*Паводле В. Хомчанкі*

Хто браў цукеркі? Як вы ставіцеся да гэтага ўчынка?

**107.** Прачытайце і адгадайце загадкі. Пра што або пра каго ў кожнай з іх гаворыцца?

1. Шчыплюць траўку каля рэчкі ў цёплых кажушках ... .



Правообладатель Народная асвета

2. Ляціць, а не птушка. Вые, а не звер.
3. Шэры зубасты звер жыве ў лесе.

Запішыце загадкі разам з адгадкамі.

Адгадкі: *воўк, авечкі, вецер.*

## Урок 26

### Графічнае адлюстраванне сказа

**108.** Прачытайце. Адкажыце, хто што робіць.

Швачка.
Цырульнік.
Повар.
Скрыпач.
Балерына.

Пакажыце дзеянні людзей гэтых прафесій.

Адкажыце на пытанні пісьмова. Зрабіце графічнае адлюстраванне сказаў.

Узор. *Швачка шые.*

Словы для даведкі: *стрыжэ, шые, танцуе, іграе, гатуе ежу.*

**109.** Прачытайце. Адкажыце на пытанні. Кожны сказ дапоўніце словам.

Унучка падае́ дзядулю (што?) ... .
Бабуля купіла ўнуку (што?) ... .
Па вуліцы едуць (што?) ... .

Запішыце адказы на пытанні. Зрабіце графічнае адлюстраванне сказаў.

Словы для даведкі: *красоўкі, акуляры, машыны.*



Правообладатель Народная асвета

*** 110.** Да дадзеных слоў падбярыце словы-дзеянні. Складзіце сказы.

1. Вартаўнік, спявачка, вецер — што робіць?

2. Трэнеры, плаўцы, электрычкі — што робяць?

Складзіце па два сказы з розных груп слоў і запішыце іх.

Зрабіце графічнае адлюстраванне сказаў.

Словы для даведкі: *плывуць, трэніруюць, едуць; спявае, дзьме, вартуе.*



## Хвілінка-весялінка

**111.** Прачытайце.

Маленькі Вася не хоча спаць. Бацька сядзіць каля яго ложка і расказвае яму казкі.

У пакоі становіцца ціха. Маці адчыняе пакой і здзіўлена пытаецца:

— Ён заснуў?

— Так, мама, заснуў, — шэптам адказвае сын.

Чаму здзівілася маці?

Хто заснуў: бацька ці сын?



Правообладатель Народная асвета

## Урок 27

### Вялікая літара ў пачатку сказа

**112.** Складзіце сказы і запішыце іх. Не забывайцеся пачынаць пісаць з вялікай літары. У канцы сказа стаўце кропку.

на, сядзелі, лаўцы, дзеці.
катаецца, на, Вова, самакаце.
у, ляшча, злавіў, рацэ, дзядуля.
дзеці, мячом, на, гуляюць, з, двары.

* **113.** Дапоўніце сказы словамі — назвамі малюнкаў.

Стол стаіць каля  .

Ваза стаіць на .

Дзяўчынка паставіла ў вазу  .

Складзіце і запішыце сказы па малюнках.

**114.** Выканайце даручэнні. Адкажыце на пытанні.

— Адкрый, калі ласка, дзверы.
Што ты робіш? — Я ... .
— Пастаў кветкі на акно.
Што ты робіш? — Я ... .
— Вазьмі падручнік і пакладзі на парту.
Што ты робіш? — Я ... .

Запішыце адказы на пытанні.

Спалучэнні слоў для даведкі: *стаўлю кветкі на акно; адчыняю дзверы; бяру падручнік і кладу на парту.*



Правообладатель Народная асвета

* **115.** Разгледзьце малюнак. Прачытайце сказы. Дапоўніце іх, змяняючы слова *стол* па пытаннях.



Дзяўчынка сядзіць за
Хлопчык стаіць каля
Кніга ляжыць на
Лямпа стаіць на
(стол).

Складзіце і запішыце сказы. Пачынайце пісаць з вялікай літары. У канцы сказаў стаўце кропку.

Зрабіце графічнае адлюстраванне аднаго сказа (па выбары).



Правообладатель Народная асвета

## *Урок 28*

### Вялікая літара ў пачатку сказа

**116.** Прачытайце.

### Хлебныя крошкі

Я неахайна адламаў кавалак хлеба. Крошкі так і пасыпаліся на падлогу. Убачыла гэта бабуля і раззлавалася.

— Ты што, хочаш голад наклікаць? — сказала бабуля ўнуку.

— Як гэта? — здзівіўся я.

— Падбярэ крошкі павук і на ліпу палезе па сваёй павуціне. Сонца даведаецца, што людзі яго дары не шануюць. Спаліць сонца сваімі гарачымі прамянямі жыта на полі.

— Даруй, бабуля! Больш так рабіць не буду.

— Цяпер збяры гэтыя крошкі ў жменьку ды курыцы занясі. Яна табе яечка знясе.

*Паводле М. Янчанкі*

### Слоўнік

**Неаха́йна** — неакуратна.

**Шану́юць** — беражліва адносяцца, берагуць штонебудзь.

Чаму бабуля раззлавалася на ўнука?

Чаму нельга неахайна ставіцца да хлеба?

Спішыце першы абзац тэксту.

Не забывайцеся пачынаць сказ з вялікай літары і ў канцы ставіць кропку.



Правообладатель Народная асвета

* **117.** Праслухайце.

## Мякіш

### (*Казка*)

Мама дала Вову лусту хлеба з маслам. Масла Вова злізаў, скарынку з’еў, а з мякішу вылепіў маленькага чалавечка. Пазабаўляўся крышачку, а потым выкінуў чалавечка ў акно. Чалавечак упаў і стукнуўся аб камень.

Мама паслала Вову ў гастраном за хлебам.

У магазіне Вова папрасіў у прадаўца буханку хлеба.

— Не давайце! — пачуўся тоненькі галасок.

З-пад прылаўка выскачыў чалавечак з мякішу.

Прадавец не дала Вову хлеба. Яна паслала яго да пекара. Пекар паслаў хлопчыка на завод. На заводзе малолі муку. Рабочыя паслалі Вову на поле. Брыгадзір пасадзіў Вову на камбайн. Даў у рукі вілы салому адкідваць. Напрацаваўся Вова, ужо і вілы ледзь трымае — так яны пацяжэлі.

Пачаўся абед. Брыгадзір адрэзаў для Вовы добры акраец хлеба. Вова трымаў у руцэ хлеб і шукаў вачамі Мякіша. Але яго нідзе не было.

*Паводле Б. Воўка*

Параўнайце, што агульнае ў хлопчыка з апавядання «Хлебныя крошкі» і Вовы з казкі «Мякіш».

Па якой прычыне ў канцы казкі знік маленькі чалавечак з мякішу?

А д к а з ы  д л я  в ы б а р у. Вова навучыўся цаніць хлеб. Маленькі чалавечак навучыў Вову працаваць.

Чаму нас вучаць гэты твор і твор з папярэдняга практыкавання?

Спішыце апошні абзац тэксту казкі.



Правообладатель Народная асвета



## Паразмаўляем

**118.** Паразмаўляйце з суседам па парце. Адзін вучань — прадавец, другі — пакупнік.

Узор.

Я хачу купіць хлеб.

— Які хлеб ты хочаш купіць: «Нарачанскі», «Майскі» ці «Барадзінскі»?

— Дайце мне, калі ласка, буханку «Нарачанскага» хлеба. Вось грошы.

— Калі ласка. Вось твая здача.

— Вялікі дзякуй.

* **119.** Прачытайце прыказкі. Пра што ў іх гаворыцца? (Пра адпачынак, жыццё, павагу да працы...) Як вы разумееце гэтыя прыказкі?

1. Малая пчала, ды і тая працуе.
2. У добрага пільшчыка піла вострая.
3. Маленькая лянота да вялікай дарасце.
4. На чужы каравай рот не разяўляй, а раней уставай ды свой здабывай.
5. Што пасееш, тое і пажнеш.
6. Сем разоў адмерай, адзін раз адрэж.
7. Усякі чалавек у працы пазнаецца.

Якія прыказкі вам больш спадабаліся?
Вывучыце іх на памяць. Ужывайце ў размове.
Запішыце тры прыказкі.



Правообладатель Народная асвета

## Урок 29

### Заканчэнне сказа адным або некалькімі словамі з дапамогай пытанняў

**120.** Прачытайце адказы на пытанні.

1. Што робіць кошка? Кошка п’е.

2. Што кошка п’е? Кошка п’е малако.

3. Кошка п’е малако з чаго? Кошка п’е малако са сподачка.

Параўнайце сказы. У якіх сказах думка выказана больш поўна?

Спішыце апошняе пытанне і адказ на яго.

**121.** Запішыце адказы на пытанні. Замяніце малюнкі словамі.

Што несла Яніна? Яніна несла ...  .

Што елі Ірына і Аляксей? Ірына і Аляксей елі ...  .

Хто гатуе ежу? Ежу гатуе ...  .

* **122.** Дапоўніце тэкст па пытаннях.

Ірынка сядзіць за сталом. У (к а г о?) ... заўтра дзень нараджэння. Дзяўчынка вырашыла зрабіць ёй (ш т о?) ... . Яна рыхтуе (к а м у?) ... ... (ш т о?) ... . Ірынка заўсёды малюе (я к?) ... ... (ч ы м?) ... .

С л о в ы і с п а л у ч э н н і с л о ў д л я д а в е д к і: *сваёй бабулі, малюнак, бабулі, падарунак, вельмі прыгожа, фламастарамі.*



Правообладатель Народная асвета

**123.** Разгледзьце малюнак. Дапоўніце сказы па малюнку і пытаннях.




Я жыву (дзе?) ... ... ... . Мая кватэра знаходзіцца (на якім паверсе?) ... ... ... . Раніцай я хаджу (адкуль?) ... ... (куды?) ... ... . У школе я вучуся (як?) ... ... .

Запішыце дапоўненыя сказы. Пытанні не запісвайце.

Словы і спалучэнні слоў для даведкі: *вельмі старанна; у чатырохпавярховым доме; на трэцім паверсе; з дому, у школу.*



Правообладатель Народная асвета

## *Урок 30*

### Заканчэнне сказа адным або некалькімі словамі з дапамогай пытанняў

**124.** Прачытайце. Закончыце сказы з дапамогай пытанняў.

**Дзень нараджэння**

У Аленкі дзень нараджэння. Яна дапамагае (к а м у?) ... накрыць на стол. Аленка паставіла (к у д ы?) ... ... (ш т о?) ... ... ... . Яна расклала (ш т о?) ... ... . Шмат гасцей будзе ў Аленкі.

Пакажыце, як вы дапамагаеце маме або бабулі накрываць на стол.

Спішыце тэкст. Устаўце патрэбныя словы.

С л о в ы і с п а л у ч э н н і с л о ў д л я д а в е д к і: *чайныя лыжачкі, маме, на стол, кубачкі са сподачкамі.*

**125.** Прачытайце. Закончыце сказы з дапамогай пытанняў.

Ніначцы падарылі (ш т о?) ... ... ... . На чайніку былі (ш т о?) ... . Ніначка паклікала (к а г о?) ... піць чай (з ч а г о?) ... ... ... . Усім спадабалася частаванне Ніначкі.

С л о в ы і с п а л у ч э н н і с л о ў д л я д а в е д к і: *з новых кубачкаў, сяброваак, гарошыны, чайнік і кубачкі.*

Выберыце назву тэксту: «Ніначка», «Частаванне», «Новы чайнік і кубачкі».

Спішыце тэкст. Устаўце патрэбныя словы.

Пакажыце, як вы будзеце накрываць на стол; запрашаць гасцей на чай; як усе разам вы будзеце піць чай.



Правообладатель Народная асвета



## Рухальная хвілінка

**126.** Слухайце і паказвайце дзеянні (адзін вучань чытае верш, другі — выконвае ролю мядзведзя, астатнія вучні — пчолы).

**Дзед-мядзведзь**

Дзед-мядзведзь
дамоў ідзе,
а за ім услед гудзе
пчолаў цэлы карагод —
дзед нясе ў калодзе
мёд.

*В. Шніп*

Чаму за мядзведзем гудзе цэлы карагод пчол? Адкажыце пісьмова.

**127.** Прачытайце. Закончыце сказы з дапамогай пытанняў.

**Глыбокая восень**

Прырода сустракала (што?) ... . (Што?) ... скончылася. Ноччу браўся (што?) ... і скоўваў тонкім (чым?) ... лужыны. Церушыў (што?) ... . Мокрае падмёрзлае (што?) ... падала (на што?) ... ... . (Што?) ... набліжалася з кожным днём.

Запішыце дапоўненыя сказы ў сшытку. Пытанні не запісвайце.

Словы для даведкі: *зіма, снег, лісце, мароз, лядком, цяпло, зіму, на зямлю.*



Правообладатель Народная асвета

**128.** Разгледзьце малюнкі. Пакажыце курыцу, куніцу, лісіцу і цацарку.



Праслухайце сказы. Адказвайце на пытанні і паказвайце жывёл.

1. Вось куніца. Вось курыца. Хто каго баіцца?
2. Вось лісіца. Вось куніца. Хто каго баіцца?
3. Вось лісіца. Вось цацарка. Хто каго баіцца?

Зверце свае адказы з дадзенымі ніжэй.

1. Курыца баіцца куніцы. 2. Куніца баіцца лісіцы. 3. Цацарка баіцца лісіцы.

## *Урок 31*

### Пашырэнне сказа адным або некалькімі словамі па пытаннях

**129.** Прачытайце тэкст. Дайце тэксту назву.

Дзеці прыйшлі ў (які?) ... лес. Мароз пафарбаваў лясы ў (які?) ... колер. Стаяць (якія?) ... сосны і елкі. На галінках дрэў ляжаць (якія?) ... шапкі. На (якіх?) ... сцежках сляды звяроў і птушак.

Назвы для выбару. «Зімовы лес», «У лесе», «Сляды на зімовых сцежках».



Правообладатель Народная асвета

Спішыце тэкст, устаўляючы словы, якія адказваюць на дадзеныя пытанні і падыходзяць па сэнсе.

Словы для даведкі: *белы, зімовы, прыгожыя, снегавыя, зімовых.*

* **130.** Прачытайце тэкст, устаўляючы ў сказы словы, якія падыходзяць па сэнсе (вусна). Што абазначаюць гэтыя словы?

Мы жывём (у якім?) ... горадзе. Наша (якая?) ... сям'я жыве на (якой?) ... вуліцы. Мы жывём (на якім?) ... паверсе. Мой пакой (які?) ... . У ім ёсць (які?) ... ложак, (які?) ... стол, (якая?) ... шафа. У мяне многа (якіх?) ... кніжак.

Напішыце пра сваю сям'ю.

Словы для даведкі: *дружная, утульны, маленькай, галоўнай, цікавых, пісьмовы, верхнім, кніжная, мяккі, вялікім.*

**131.** Прачытайце. Дапоўніце сказы словамі, адказваючы на пытанні.

які? якія? якія?
Яня піла ... **сок.** ... **дзеці** спявалі ... **песні.**
якая?
У магазіне ... **смятана.**
якое?
Мама прыгатавала ... **снеданне.**

Запішыце пашыраныя сказы. Падкрэсліце ўстаўленыя словы. Што абазначаюць гэтыя словы?

Словы для даведкі: *свежая, вясёлыя, персікавы, смачнае, беларускія.*



Правообладатель Народная асвета



## Хвілінка-весялінка

**132.** Прачытайце.

Ягорка ўбачыў цяля і гаворыць тату:
— Якое прыгожае каравяня!

Выпраўце смешнае слова і скажыце правільна.

### Супакоіў

— Васілёк, няўжо ты пойдзеш купацца? На вуліцы вельмі халоднае надвор'е.
— Не хвалюйся, бабулечка! Я надзену шапку.

*Паводле У. Мацвеенкі*

Што б вы адказалі сваёй бабулі? Дайце жартаўлівы адказ.

Адказы для даведкі: *я апрану футра і надзену валёнкі, я захаплю з сабой гарачы чай і грэлку.*

## *Урок 32*

### Пашырэнне сказа адным або некалькімі словамі па пытаннях

**133.** Прачытайце. Дапоўніце сказы адным або некалькімі словамі па пытаннях.

На свяце была (якая?) ..., ... ёлка. На ёй віселі (якія?) ... цацкі. Каля ёлкі дзеці вадзілі (які?) ... карагод. На дзецях былі (якія?) ... ... касцюмы.

Запішыце сказы без пытанняў. Дайце тэксту назву на выбар: «Новы год», «Вясёлы карагод», «Любімае свята».



Правообладатель Народная асвета

Раскажыце, як вы будзеце святкаваць Новы год. Які касцюм вам пашые маці? Якое свята вы любіце больш за іншыя? (Новы год, дзень нараджэння, 8 Сакавіка...)

С л о в ы д л я д а в е д к і: *вясёлы, прыгожая, розныя, вялікая, навагодні, цудоўныя.*

**134.** Падзяліцеся на групы (па чатыры вучні). Выберыце ў кожнай групе кіраўніка. Падрыхтуйце ў групе адказы на пытанні настаўніка. Пытанні агучвае кіраўнік групы, групе ставіцца адна адзнака. Настаўнік выкарыстоўвае пытанні з практыкаванняў 119, 130, 133.

**135.** Прачытайце. Устаўляйце словы па сэнсе. Карыстайцеся словамі для даведкі.

Бабуля атрымала ад ўнука (я к і?) ... падарунак. Настаўніца задала вучню (я к о е?) ... пытанне. У дзяцей пачаліся (я к і я?) ... канікулы. У Люсі (я к а я?) ... прычоска. Мама адкрыла (я к о е?) ... варэнне.

Спішыце сказ пра падарунак для бабулі. Напішыце, якія падарункі вы дарылі сваёй бабулі ці свайму дзядулю.

Разыграйце з суседам па парце сцэнку віншавання бабулі.

С л о в ы д л я д а в е д к і: *складанае, салодкі, зімовыя, прыгожая, малінавае.*



## Хвілінка-весялінка

**136.** Прачытайце ўважліва і адгадайце вясёлыя загадкі.

Які год цягнецца адзін дзень?
Як паставіць чатырох хлопчыкаў у адным боце?

А д г а д к і: зняць з кожнага па адным боце; Новы год.



Правообладатель Народная асвета

*Урок 33*

## Пашырэнне сказа адным або некалькімі словамі па пытаннях

**137.** Адкажыце вусна на пытанні поўным сказам (усім класам па чарзе).

1. Які першы месяц года? — ... .
2. У студзені цёпла ці холадна? — ... .
3. Які апошні месяц года? — ... .
4. Які першы дзень тыдня? — ... .
5. Які апошні дзень тыдня? — ... .
6. Які сёння дзень тыдня? — ... .
7. Якую пару года ты больш за ўсё любіш? Чаму? — ... .
8. Якое надвор'е ты больш за ўсё любіш? (Сонечнае, пахмурнае, дажджлівае.) — ... .

Адкажыце пісьмова на два апошнія пытанні.



### Хвілінка-весялінка

* **138.** Прачытайце вясёлую небылічку.

Пчолы спяць зіму ў бярлозе,
А мядзведзь — у вуллі.
Конь спявае на бярозе,
вераб'я ў плуг запраглі.
Сена з лугу прыляцела
і ў хляве карову з'ела.

*М. Пазнякоў*

Выпраўце небылічку. Адкажыце на пытанні.

Дзе спяць зіму пчолы?



Правообладатель Народная асвета

Дзе зімой спіць мядзведзь?
Хто спявае на бярозе?
Каго запраглі ў плуг?
Што прывезлі карове з лугу?
Што з’ела карова?

**139.** Задайце адзін аднаму пытанні па чарзе. Разгледзьце малюнкі. Да якіх пытанняў дадзены малюнкі?






1. Якія насякомыя збіраюць мёд? — ... .
2. Якія свойскія птушкі нясуць яйкі? — ... .
3. Якія жывёлы даюць нам воўну (шэрсць)? — ... .
4. Якая жывёліна цягне плуг, воз, сані? — ... .
5. Якія жывёлы даюць малако?

Адкажыце пісьмова на першыя тры пытанні.



## Паразмаўляем

**140.** Адкажыце на пытанні. Працуйце ў пары, мяняйцеся ролямі.

— Якія хлопчыкі і дзяўчынкі табе падабаюцца? Сціплыя, смелыя, добрыя, ветлівыя, вясёлыя?
— Якія гульні ты больш за ўсё любіш? Рухавыя, спартыўныя, настольныя, маўленчыя?
— Якое слова табе больш за ўсё падабаецца: «на» ці «дай»? Чаму?



Правообладатель Народная асвета

* **141.** Прачытайце. Разгледзьце малюнкі.





На лузе летам дзеці збіралі кветкі.

Дзяўчынкі назвалі свой букет «Вясёлка». У букеце дзяўчынак былі кветкі такіх колераў: ..., ..., ..., ..., ..., ..., ... .

Колькі колераў было ў букеце дзяўчынак? Назавіце гэтыя колеры. Назвы колераў вам падкажа вясёлка і першыя літары слоў сказа: **Ч**ыжоў **А**ркадзь **ж**адае **з**найсці **б**лакітную, **с**інюю **ф**арбу.

Хлопчыкі назвалі свой букет «Святлафор». У букеце хлопчыкаў кветкі былі такіх колераў: ..., ..., ... .

Колькі колераў было ў букеце хлопчыкаў?
Назавіце гэтыя колеры. Вам падкажа святлафор.

Прачытайце верш Веры Вярбы.



Якія добрыя алоўкі
мне ўчора тата падарыў —
сабраны з колераў вясёлкі
і красак летняе зары...

Намалюйце дома лугавыя кветкі колераў вясёлкі.

Словы для даведкі: *чырвоны, аранжавы, жоўты, зялёны, блакітны, сіні, фіялетавы.*



Правообладатель Народная асвета

## *Урок 34*

### Складанне сказаў па пытаннях настаўніка

**142.** Параўнайце памідор і агурок. Адкажыце на пытанні. Складзіце сказы і запішыце.

Якія па колеры памідор і агурок?
Якія яны па форме?

Словы для даведкі: *прадаўгаваты, круглы, зялёны, чырвоны.*

**143.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце і пакажыце назвы прадметаў мэблі. Адкажыце на пытанні пісьмова.





Хто спіць на ложку?
Хто сядзіць на крэсле і глядзіць тэлевізар?
Хто сядзіць за сталом і робіць урокі?

Словы для даведкі: *дзяўчынка, дзядуля, хлопчык.*

### Паразмаўляем

**144.** Папрасіце маму купіць вам кацяня. Ролю мамы выконвае ваш сусед (ваша суседка) па парце.

Узор.

— Мама, купі мне, калі ласка, кацяня!
— Якога колеру кацяня ты хочаш?



Правообладатель Народная асвета

— Я хачу чорненькага (шэранькага, беленькага ці іншага колеру).

— Купіць маленькага ці вялікага?

— Я хачу маленькага.

— Як ты яго хочаш назваць?

— Мне падабаецца Шустрык (Фелікс).

**145.** Разгледзьце малюнкі. Дайце дзецям імёны. Складзіце сказы па малюнку і пытаннях.



1. Якая цяпер пара года?
2. Што робяць хлопчыкі?
3. Што робіць дзяўчынка?

Запішыце складзеныя сказы.

Пакажыце, як людзі ходзяць на лыжах.



Правообладатель Народная асвета

## Урок 35

### Складанне сказаў па пытаннях настаўніка

**146.** Разгледзьце малюнкі. Пакажыце на малюнках, дзе Соня, а дзе Сеня.





Адкажыце пісьмова на пытанні.

Што робяць Соня і Сеня на вуліцы?

Што здарылася з імі?

Што вы параіце хлопчыку і дзяўчынцы? (Выберыце парады: «Не трэба есці марожанае на вуліцы зімой», «Зімой марожанае лепш есці дома», «Піце чай з малінавым варэннем».)

**147.** Прачытайце.



Я думаў, што сініца атрымала сваю назву за сіні колер. Зімой я разгледзеў гэтых птушак. У сініцы толькі галава сіняя. Грудка ў яе



Правообладатель Народная асвета

жоўтая, хвосцік — чорны, спінка — зеленаватая, шчочкі — белыя.

У сінічкі звонкая песенька.

*Паводле Ю. Дзмітрыева*

Выпішыце словы, што абазначаюць колер (акрас) галоўкі, грудкі, хвосціка, спінкі і шчочак сінічкі.

Чаму пра гэту птушку гавораць, што яна *зеленаватая*?

* **148.** Дапішыце сказы. Вам дапамогуць каляндар, пытанні і словы для даведкі.

Сёння серада.
Калі быў аўторак? — Аўторак быў ... .
Калі быў панядзелак? — Панядзелак быў ... .
Калі будзе чацвер? — Чацвер будзе ... .
Калі будзе пятніца? — Пятніца будзе ... .

Словы для даведкі: *учора, заўтра, паслязаўтра, пазаўчора*.

**149.** Прачытайце назвы адзення. Адкажыце, што носяць зімой, што — летам.

**Адзенне**

| | | |
|---|---|---|
| паліто | сукенка | футра |
| спадніца | шкарпэткі | хустка |
| шорты | панчохі | пінжак |
| кашуля | світар | камізэлька |
| штаны | фартух | шалік |

Запішыце сказы.

Паліто, футра, плашч — гэта вопратка. Вопратку апранаюць.



Правообладатель Народная асвета

Штаны, сукенка, світар — гэта адзенне. Адзенне надзяваюць.

Запішыце адказы на пытанні.

Што апранаюць? Апранаюць куртку, ..., ... .
Што надзяваюць? Надзяваюць спадніцу, ..., ... .

**150.** Паказвайце і называйце на малюнках абутак. Прачытайце пра краўца і шаўца.



**Абутак**

Сандалі, боцікі, паўбоцікі, чаравікі, пантофлі, валёнкі, туфлі, басаножкі.

Кравец шые адзенне. Шавец рамантуе абутак.

Адкажыце на пытанні пісьмова.

1. Што робіць кравец?
2. Што робіць шавец?
3. Які абутак носяць зімой?
4. Які абутак носяць летам?

Запішыце сказ.

Боцікі, басаножкі, ... — гэта ... .



Правообладатель Народная асвета

## Урок 36

### Складанне сказаў па пытаннях настаўніка

**151.** Прачытайце. Адкажыце на пытанні (пісьмова або вусна).

Узор. *Мама купляе прадукты, ... .*

Чаму мы павінны шанаваць і любіць сваю матулю?
Што робіць мама для сваіх дзяцей?
Што робіць ваша мама для вас?

Словы і спалучэнні слоў для даведкі: *ходзіць у магазін, гатуе ежу, купляе прадукты і адзенне, мые бялізну, прыбірае ў кватэры, даглядае ў час хваробы, дапамагае рыхтаваць урокі.*



### Хвілінка-весялінка

* **152.** Прачытайце верш Т. Кляшторнай.

У бабулі ў агародзе
пабываў сягоння злодзей.
Ён качан капусты з’еў
і з удзячнасцю глядзеў
на бабулю і на дзеда.
«М-э-э-э!
Я смачна паабедаў».

Адкажыце поўным сказам: хто пабываў у агародзе бабулі і дзеда?

**153.** Складзіце сказы па пытаннях.

Капуста вырасла (дзе?) на ... .
Салавей жыве (дзе?) у ... .



Правообладатель Народная асвета

Кветкі выраслі (д з е?) у ... .
Рыба плавае (д з е?) у ... .

С л о в ы д л я д а в е д к і: *вадзе, гняздзе, градзе, садзе.*



**154.** Разгледзьце малюнак. Складзіце сказы па малюнку. Жэстамі пакажыце словы ***на*** і ***пад***. Вам дапамогуць словы для даведкі.

Хто на дрэве?
Хто пад дрэвам?

С л о в ы і с п а л у ч э н н і с л о ў д л я д а в е д к і: *маленькі рухавы звярок, маленькі звярок у белым кажушку.*

## *Урок 37*

### Упарадкаванне дэфармаванага сказа

**155.** Складзіце са слоў сказы і запішыце.

1. Пра, Света, малюнкі, разглядае, зіму.
2. На, дзеці, двары, у, гуляюць, снежкі.
3. З, Міша, гары, і, Сеня, на, едуць, санках.
4. Са, Алена, снегу, з, снегавіка, Лёшам, лепяць.

Абмяркуйце з суседам па парце: ці любіце вы зіму? Чаму? Пакажыце сваю размову класу.

**156.** Складзіце са слоў сказы. Дайце тэксту назву на выбар: «Зімовы лес», «Дзеці ў зімовым лесе», «Вавёрка», «Дзеці заблудзіліся». Запішыце тэкст.

У, дзеці, зімовы, прыйшлі, лес. На, ўбачылі, яны, дрэве, вавёрку. На, дрэва, вавёрка, з, скакала, дрэва. За, дзеці, бегалі, і, заблудзіліся, вавёркай.



Правообладатель Народная асвета

* **157.** Складзіце і запішыце сказы. У вас атрымаўся тэкст ці асобныя сказы?

### Як звяры лечацца

У, свая, звяроў, аптэка, ёсць. Траву, ліс, жывіцу, шукае. Карой, ды, асінавай, лечыцца, лазой, зайчык. Каранямі, дзік, і, вожык, барсук, рознымі, лечацца. Соль-лізунец, хворыя, ліжуць, козы. Мухаморы, шукае, і лось, есць.

### Слоўнік

**Лаза́** — гнуткая галіна вярбы.

* **158.** Прачытайце небылічку.

### Сон

Птушкаферма сніцца мішку.
Сніцца лісу мёд.. міска.
Сніцца зайчыку хлеба луст.. .
Сніць цялятка капуст.. .
А свавольніку Ігнатку
сніцца ў дзённіку дзясятка.

*Паводле А. Пісьмянкова*

Выпраўце небылічку. Калі будзе складана, выканайце заданне па плане:

1) перачытайце верш;
2) назавіце, хто сніць сны;
3) успомніце, хто са звяроў што любіць;
4) змяніце словы па сэнсе.

Узор. *Мёду міска сніцца мішку.*

Запішыце выпраўленую небылічку.



Правообладатель Народная асвета



## Хвілінка-весялінка



**159.** Прачытайце. Разгледзьце малюнак.



### Пацеха

— Вось пацеха
дык пацеха! —
лось заходзіцца
ад смеху.

— Паглядзіце:
для казы
лапці воўк
пляце з лазы.

*А. Бабіцкі*



Што смешнага лось знайшоў у гэтым выпадку? Пакажыце, як заходзіцца ад смеху чалавек.

## *Урок 38*

### Упарадкаванне дэфармаванага сказа

**160.** Складзіце сказы.

На, Насця, гару, і, ідуць, Сымон. У, санкі, Сымона. На, Насцю, возіць, санках Сымон. За, бегае, дзецьмі, Тузік, сабака.

Дайце тэксту загаловак. Выберыце: «Дзеці на гары», «Дзеці на санках», «Дзеці і Тузік».

Запішыце тэкст.

**161.** Са слоў складзіце сказы. Вызначыце тэму тэксту. Выберыце: «Дапамога птушкам», «Птушкі галадаюць зімой», «Зімовыя забавы».

У, снегавіка, хлопчык, са, зляпіў, садочку, снегу. Зрабіў, вялікай, з морквы, нос. Снегавіку, рукі, у, кармушку, з, даў, зярнятамі, хлопчык.



Правообладатель Народная асвета

Першымі, сінічкі, і, прыляцелі, снягір. У, кармушку, верабей, з, залез, нагамі, нахабны.

У, чорная, прыляцела, апошняй, галка, кармушку. Пуста, у, было, кармушцы. Са, галка, злосці, каркнула.

*Паводле В. Хомчанкі*

Запішыце тую частку тэксту, якая вам больш падабаецца.



## Рухальная хвілінка

* **162.** Гульня «Гусі і воўк». Дзеці пры дапамозе лічылкі выбіраюць ваўка. Астатнія дзеці — гусі. Воўк ловіць гусей. Каго воўк зловіць, той становіцца ваўком.

Раз, два, тры, чатыры, пяць,
воўк з лісой пайшлі гуляць,
следам вожык тупаціць,
мы пайшлі... Табе лічыць.

Пакажыце, як воўк з лісой ідуць гуляць; як следам тупаціць вожык.

**163.** Складзіце сказы. Дайце тэксту загаловак па выбары: «Халодная зіма», «Сінічка і дзеці», «Галодная птушачка».

У, была, гэтым, халодная, годзе, зіма. Да, сінічка, прыляцела, акна. Фортачку, дзеці, адчынілі. У, сінічка, пакой, уляцела. Дзеці, хлебных, птушачцы, далі, крошак. На, хлебныя, птушачка, стале, дзяўбці, стала, крошкі. Жыла, усю, сінічка, у, зіму, клетачцы.

Запішыце тэкст з загалоўкам.



Правообладатель Народная асвета

# СЛОВЫ
# СЛОВЫ — НАЗВЫ ПРАДМЕТАЎ

## *Урок 39*

### Вычляненне слова са сказа

**164.** Разгледзьце малюнак. Адкажыце на пытанні поўным сказам па ўзоры.



Што расце каля хаты? *Каля хаты расце* (ш т о?) <u>дрэва</u>.

Хто ляжыць у будцы? *У будцы ляжыць* (х т о?) <u>сабака</u>.

Што стаіць пад дрэвам? ... .

Што стаіць на стале? ... .



Правообладатель Народная асвета

Хто ляжыць на лаўцы? ... .
Што расце за плотам? ... .
Хто прывязаны да плота?

Запішыце па два адказы на пытанні ш т о? і х т о?

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *сланечнік, стол, ваза з кветкамі, кот, конь.*

**165.** Прачытайце, якія гасцінцы дзеці падарылі Аленцы. Якімі ласункамі частавала Аленка сваіх сяброў?

**Гасцінцы для Аленкі:** *кветкі, цацкі, кніжкі, паштоўка, цукеркі.*

**Ласункі для дзяцей:** *марожанае, торт, яблыкі, апельсіны, мандарыны, бананы.*

Прачытайце тэкст. Спішыце яго. Устаўце патрэбныя словы.

Сёння ў Аленкі дзень нараджэння. Да яе ў госці прыйшлі ... . ... падарылі Аленцы розныя ... . Аленка шчыра падзякавала ... і запрасіла іх за стол. Яна пачаставала ... рознымі ... .

Прачытайце і адгадайце загадку. Вы даведаецеся, якія кветкі сябры падарылі Аленцы.

Стаяць каля сцежкі Юлькі,
на іх белыя кашулькі.
Сэрцы іх залатыя.
Адгадайце, хто такія.

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *гасцінцы, сябры, гасцей, сябрам, ласункамі, госці, рамонкі.*



Правообладатель Народная асвета

**166.** Прачытайце.

Бабуля збіраецца шыць. За ёй з дрэва назірае варона. Бабуля не знайшла патрэбны прадмет для шыцця.

Разгледзьце ўважліва малюнкі. Параўнайце намаляваныя прадметы. Што сцягнула варона?





Запішыце назву прадмета, які сцягнула варона.

Як вы думаеце, чаму варона ўкрала менавіта гэты прадмет?

Выберыце правільны адказ.

Варона сцягнула тое, што першым кінулася ў вочы.
Варона схапіла прадмет для шыцця.
Варона знесла бліскучую рэч.

Словы і спалучэнні слоў для даведкі: *гузік, шпулька нітак, напарстак, іголка з ніткай, нажніцы, прас.*



Правообладатель Народная асвета

* **167.** Прачытайце верш, устаўляючы патрэбныя словы. Спішыце верш. Устаўце патрэбныя словы.

**Падарунак**

Падарылі ... госці —
незвычайнай прыгажосці.
Сшыю ёй ...,
дам у рукі ...,
падару яшчэ ... —
хай глядзіцца, есць ... .

*Н. Раманенка*



Словы для даведкі: *камбінезон, парасон, ляльку, люстэрка, цукеркі.*

## *Урок 40*

### Словы як назвы прадметаў, прымет прадметаў і дзеянняў прадметаў

**168.** Прачытайце.

| што? | які? | што рабіць? |
|---|---|---|
| святло | светлы | свяціць |
| пісьмо | пісьмовы | пісаць |
| шум | шумны | шумець |
| дым | дымны | дымець |
| мароз | марозны | марозіць |
| смех | смешны | смяшыць |

Выпішыце з кожнага слупка па два словы. Напішыце загалоўкі: словы — назвы прадметаў; словы — назвы прымет; словы — дзеянні прадметаў. Дабаўце па адным сваім прыкладзе ў кожны слупок.



Правообладатель Народная асвета

**169.** Прачытайце. Падзяліце на сказы.

Падзьмуў моцны вецер закалыхаліся маладыя дрэўцы пасыпаўся пушысты снег пачалася моцная мяцеліца.

Запішыце. Падкрэсліце словы — назвы прадметаў адной прамой лініяй; словы — дзеянні прадметаў — дзвюма лініямі; словы — назвы прымет — хвалістай лініяй.

**170.** Праслухайце. Якую песню спявала бабуля ўнуку?

### Бабуліна песня

Бабуля спявала
вячэрнюю песню:
«Расці, мой унучак,
пад сонейкам веснім,
пад сонейкам летнім,
асеннім, зімовым.

Расці ты разумным,
прыгожым, здаровым.
Хай сэрца тваё
будзе добрым і чуйным.
Яшчэ, мой няўрымслівы,
вельмі хачу я,
каб гэтую песню
і родны парог
нідзе і ніколі
забыць ты не змог».

*Н. Галіноўская*

## Слоўнік

**Няўры́мслівы** — неспакойны; непаседлівы.

Пад якім сонейкам бабуля жадала расці ўнуку? Пералічыце і запішыце ў сваім сшытку.

Узор. *Бабуля жадала ўнуку расці пад ..., ..., ..., ... сонейкам.*



Правообладатель Народная асвета

Бабуля хоча, каб унук яе вырас ..., ..., ... .
Бабуля хоча, каб у яго было сэрца ..., ... .
Бабуля называе свайго ўнука мой ... .

Што яшчэ бабуля вельмі хоча ад унука? Прачытайце з пачуццём любові для свайго дома, сваёй Радзімы.

Вывучыце на памяць некалькі радкоў бабулінай песні. Пачніце са слоў: «Расці ты разумным...»

**171.** Разгледзьце малюнак. Адкажыце на пытанні.



Чаму бабуля сядзіць у інваліднай калясцы? Што прынёс бабулі хлопчык? Пакажыце, як ён частуе бабулю яблыкам.

Чаму бабуля ўсміхаецца хлопчыку? Чаму ён усміхаецца бабулі?

Словы для даведкі: *яны ўдзячныя адзін аднаму; яны любяць адзін аднаго; хлопчык клапоціцца аб бабулі.*

Назавіце тры словы, якія характарызуюць хлопчыка. Які ён?

Словы для даведкі: *добры, спагадлівы, абыякавы, уважлівы, клапатлівы, спачувальны.*

**172.** Слухайце словы ўважліва. Калі пачуеце слова — назву прадмета, падыміце правую руку; калі слова — дзеянне прадмета — левую руку; калі слова — назву прыметы прадмета — складзіце абедзве рукі перад сабой.

Варэнне, варыць, вараны; мароз, марозіць, марозны; садзіць, сад, садовы; снежань, снежыць, снежны; студзіць, сцюдзёны, студзень; будаваць, будаўнік, будаўнічы.



Правообладатель Народная асвета

## *Урок 41*

### Словы як назвы прадметаў, прымет прадметаў і дзеянняў прадметаў

**173**. Разгледзьце малюнак. Прачытайце верш пра зіму.

### Вясёлая зіма



Прыйшла зіма вясёлая
са звонкімі канькамі,
з лыжнёю размалёванай,
з чароўнымі агнямі.

На ёлцы ўпрыгожанай
ліхтарыкі красуюцца.
Няхай зімой вясёлаю
ўсе вакол любуюцца.

*У. Хадзілян, 6 клас*

Раскажыце пра зіму па малюнку і тэксце. Якая зіма? Што робяць дзеці і дарослыя зімой? Што робіць зіму прыгожай? Чаму вы любіце зіму?



Правообладатель Народная асвета



## Хвілінка-весялінка

**174.** Прачытайце.

### Перахваліў

Дзядзька купляе гадзіннік і пытаецца ў прадаўца:

— А ці добры ён? Ці добра ён ходзіць?

— Вельмі добры! Ён нават бегае. Не тое, што ходзіць. Гляньце самі. Яшчэ паўдня няма, а ён ужо пятую гадзіну вечара паказвае.

— На жаль, мне патрэбен гадзіннік, які не бегае, а ходзіць.

*З часопіса «Пралеска».*

**175.** Прачытайце.

### Мурлыка

Я люблю ката Мурлыку.
Ён вусаты, невялікі.
Ён умее муркаць, мяўкаць
і хадзіць нячутна, мякка.
Мыцца ўмее адной лапкай.
Мяккай лапкай, а не драпкай.

*Ю. Свірка*

Выпішыце з верша два словы, якія апісваюць ката.

Кот ..., ... .

Выпішыце словы, якія гавораць пра тое, што кот умее рабіць.

Кот умее ..., ..., ..., ... .

Пакажыце дзеянні ката.

Запішыце два сказы пра вашага ката або сабаку. Што ён умее рабіць?

Якая ў яго мянушка?



Правообладатель Народная асвета



## Паразмаўляем

**176.** Ваш любімы кот перавярнуў вядро са смеццем. Што вы зробіце? Пакажыце вашы дзеянні.

1. Адлуплю ката.
2. Пасваруся на яго.
3. Нічога не скажу. Прыбяру ціха і хутка, пакуль не прыйшлі з працы бацькі.

Чаму вы зробіце так, а не інакш? Што будзе жорсткім, а што бескарысным?

### *Урок 42*

### Словы — назвы прадметаў

**177.** Дапішыце сказы.

Расце (што?) ... (бульба). Плыве (што?) ... (лодка). Піша ліст бабулі (хто?) ... (унук). Сядзяць у кінатэатры (хто?) ... (школьнікі).

Словы — назвы прадметаў адказваюць на пытанні хто? або што?
Словы — назвы людзей і жывёл адказваюць на пытанне хто? *Настаўніца, сініца.*
Назвы іншых, нежывых прадметаў адказваюць на пытанне што? *Памідор, агурок.*

**178.** Выпішыце словы па ўзоры.

Узор. хто? — *снягір*; што? — *кветкі*

Снягір, кветкі, грак, вучань, парта, сарока, званочак, голуб, маланка, лісіца.



Правообладатель Народная асвета

**179.** Дапоўніце сказы словамі — назвамі прадметаў, якія вы бачыце на малюнку.






Са шкла можна зрабіць вазу, ... .
З паперы можна зрабіць шпалеры, ... .
З дрэва можна зрабіць стол, ... .



## Паразмаўляем

**180.** Адзін вучань выконвае ролю настаўніка. Ён пытаецца ў дзяцей і ў настаўніцы, што кожнага з іх сёння радуе. Яны адказваюць.

Узор.
— Я сёння пазнаёмілася з новай дзяўчынкай (новым хлопчыкам).

* * *

— Мой сабачка паправіўся пасля хваробы.

* * *

— Мы з сябрам збіраемся катацца на лыжах.

* * *

— Мне падабаецца выконваць ролю мастака.



Правообладатель Народная асвета

## *Урок 43*

### Вызначэнне слоў — назваў прадметаў па пытаннях

**181.** Разгледзьце малюнак. Назавіце прадметы на малюнку.




Запішыце словы, якія называюць прадметы на малюнку, у два слупкі.

| х т о? | ш т о? |
|---|---|
| хлопчыкі | клас |
| ... | |

С л о в ы   д л я   д а в е д к і: *кветкі, сшыткі, сталы, крэслы, вазоны, хлопчыкі, настаўніца, дошка, дзяўчынкі, вучні, вокны.*



Правообладатель Народная асвета

**182.** Чытайце словы і стаўце да іх пытанні (хто? або што?).

Фігурыстка, канькі, санкі, дзеці, прадавец, пакупнік, падручнікі.

Выпішыце спачатку словы, якія адказваюць на пытанне хто?, потым — што?

* **183.** Да назваў звяроў і птушак падбярыце назвы маладых істот.

Кот — кацяня,
воўк — ... ,
заяц — ... ,
ліса — ...,
шпак — ...,
бусел — ...,
гусь — ...,
верабей — ... .

На якое пытанне адказваюць усе гэтыя словы?

Словы для даведкі: *лісяня, шпачаня, бусляня, ваўчаня, гусяня, зайчаня, вераб'яня.*



## Паразмаўляем

**184.** Раскажыце аднакласнікам, што вы зробіце і чаму.

Сябар паведаміў вам сваю тайну і папрасіў нікому пра яе не расказваць. Вашы дзеянні:

1) нікому ніколі не раскажу;
2) раскажу бліжэйшаму сябру;
3) раскажу настаўніцы;
4) параюся з бацькам;
5) раскажу маме;
6) раскажу, калі тайна пагражае бяспецы сябра.



Правообладатель Народная асвета

## *Урок 44*

### Падбор слоў, якія адказваюць на пытанні хто? што?

**185.** Прачытайце. Стаўце да слоў пытанні хто? або што?

| Адзін (адна, адно) | Шмат |
|---|---|
| *апельсін* | *апельсіны* |
| птушка | ... |
| поле | ... |
| зубр | ... |
| самалёт | ... |

Змяніце словы па ўзоры. Запішыце змененыя словы з пытаннямі.

Словы для даведкі: *палі, птушкі, зубры, самалёты.*

Словы — назвы прадметаў могуць абазначаць адзін прадмет і многа прадметаў.

*Дом — дамы, сяброўка — сяброўкі.*

**186.** Прачытайце. Змяніце словы ў дужках па ўзоры.

1. Каля школы пасадзілі (дрэўца). — *Каля школы пасадзілі* (што?) *дрэўцы.*
2. За партай сядзіць (дзіця). — *За партай сядзяць* (хто?) *дзеці.*
3. На стале ляжыць (кніжка). — ... .
4. Па дарозе едзе (машына). — ... .
5. Каля дошкі стаіць (вучань). — ... .

Запішыце змененыя сказы.



Правообладатель Народная асвета

**187.** Прачытайце. Замяніце вылучаныя словы адным словам. Запішыце сказы з новымі словамі.

1. У лесе дзеці збіралі (што?) **чарніцы, маліны, брусніцы.**
2. У вырай паляцелі (хто?) **гусі, жураўлі, буслы.**
3. У нашых лясах жывуць розныя (хто?) **ваўкі, лісіцы, зубры, мядзведзі, ласі.**
4. Мая сястрычка любіць (што?) **рамонкі, ружы, васількі, ландышы.**

Узор. *У лесе дзеці збіралі* ***ягады****.*

Запішыце, якія грыбы вы збіралі, якія кветкі любяць ваша мама і бабуля.

Словы для даведкі: *апенькі, лісічкі, сыраежкі; ружы, рамонкі, астры, цюльпаны.*



## Паразмаўляем

**188.** Зрабіце ўтраіх інсцэніроўку.

Узор.

— Зоя Пятроўна, Васіль браў мой сшытак, на ім засталіся плямы.

— Галя і Васіль, давайце абмяркуем гэту сітуацыю. Што ты скажаш, Васіль, пра гэта?

— Прабач мне, Галя! Я ненаўмысна. Я больш гэтага рабіць не буду.

— Галя, добра, што ты сказала пра тое, што табе не падабаецца. Прабач Васіля. Будзь добразычлівай.

— Я табе, Васіль, прабачаю. Толькі мый рукі.



Правообладатель Народная асвета

## *Урок 45*

### Ужыванне слоў — назваў прадметаў у адказах на пытанні

**189.** Прачытайце. Выпішыце спалучэнні слоў са словам *сябра*.

Мой сябра Аляксей вучыцца разам са мной у чацвёртым класе. Сёння ў школе не было (каго?) майго сябра. Ён захварэў. Урач выпісаў рэцэпт (каму?) майму сябру. Пасля школы я абавязкова наведаю (каго?) свайго сябра. Я занясу (каму?) свайму сябру апельсіны. Я сябрую (з кім?) са сваім сябрам. Вось чаму ў сваім сачыненні я напісаў (аб кім?) аб сваім сябры.

* **190.** Прачытайце. Дапішыце словы — назвы прадметаў.

Думаць (пра каго?) пра ..., прачытаць (што?) ..., пайсці (па што?) па ..., адказаць (на што?) на ..., пагутарыць (з кім?) з ..., пакатацца (на чым?) на ..., плысці (да чаго?) да ..., смяяцца (з каго?) з ... , дзякаваць (каму?) ... .

Словы для даведкі: *ваду, кнігу, пытанне, настаўніцы, суседам, брата, санках, ката, берага.*



### Хвілінка-весялінка

**191.** Прачытайце.

— Чаму ты, сынок, нічога ў час не робіш? Помні, што адклад не ідзе на лад.



Правообладатель Народная асвета

— Ах, калі так, мамачка, то аддай мне сёння тыя цукеркі, што схавала на заўтрашні дзень.

Які хлопчык: хітры, кемлівы, жартаўлівы?

* **192.** Прачытайце словы ў першым слупку. Да слоў з другога і трэцяга слупка стаўце пытанні.

| | **даць камý? чамý?** | **ганарыцца кім? чым?** |
| --- | --- | --- |
| сястра | сястры | сястрой |
| сястрыца | сястрыцы | сястрыцай |
| зямля | зямлі | зямлёй |
| зямелька | зямельцы | зямелькай |
| рака | рацэ | ракой |
| рэчка | рэчцы | рэчкай |

Складзіце па два сказы са словамі з другога і трэцяга слупкоў.

## *Урок 46*

### Ужыванне слоў — назваў прадметаў у адказах на пытанні

**193.** Прачытайце. Спішыце верш. Змяніце словы ў дужках так, каб яны адказвалі на пытанне ч а г о?

У Лявонкі рукі,
рукі, ну як трэба,
а як есці сядзе —
не адрэжа (хлеб).

Не насыпле (цукар),
не нальe ён (чай).
Толькі адно чуеш:
— Мама, я чакаю...

*П. Прануза*

Пра каго расказваецца ў вершы: пра хлопчыка ці пра дзяўчынку?
Якія рукі ў Лявонкі?



Правообладатель Народная асвета

Як вы разумееце выраз: «рукі, ну як трэба»?

Што вы можаце расказаць пра Лявонку? Якім ён бывае? Хто вінаваты ў гэтым: яго рукі ці ён сам?

Якія рукі ў вас? (Умелыя, няўмелыя, добрыя, залатыя.)

Пра якога чалавека гавораць: «У яго залатыя рукі»?

Словы для даведкі: *хлеба, цукру, чаю.*

**194.** На чым прыедуць на навагодняе свята Дзед Мароз і Снягурка? Адкажыце на пытанні пісьмова.

На (у) ... (на трамваі, у цягніку, на самалёце, у карэце, на санях).

Каму сёння (учора) прыйшоў ліст — віншаванне са святам? (Марыне, Маі, бабулі, настаўніцы, урачу, маме, тату, дзядулю.)

**195.** У чым сёння прыйшлі ў школу Міхась і Аленка? Закончыце сказы.

Міхась апрануў ... . Ён надзеў ..., ..., ... .
Аленка апранула ... . Яна надзела ..., ..., ... .

Нагадаем. Апранаюць вопратку.
Надзяваюць адзенне.

У якім абутку дзеці прыйшлі ў школу? Што абулі на свята?

Міхась прыйшоў у школу ў ... . На свята ён абуў ... .
Аленка прыйшла ў школу ў ... . На свята яна абула ... .

Запішыце, у чым вы прыйшлі сёння ў школу. Што вы звычайна надзяваеце на свята?

Словы для даведкі: *сукенцы, штанах, спадніцы, блузцы, світары, пінжаку, кашулі, шапцы, хустцы, паліто, футра*; *боціках, валёнках, туфлях, басаножках, чаравіках, сандалях.*



Правообладатель Народная асвета



## Хвілінка-весялінка

**196.** Прачытайце.

Міша гуляў на двары ў хакей і разбіў сабе нос. Прыйшоў дадому. Плача. А старэйшая сястра і кажа:

— Я так і ведала, што гэта будзе.

Міша — праз слёзы:

— Калі ты ведала, сястрычка, дык чаму ж мне не сказала?

Што б вы сказалі свайму малодшаму брату або малодшай сястры, калі яны ідуць на двор гуляць?

Спалучэнні слоў для даведкі: *будзь асцярожным, глядзі пад ногі, нос не задзірай, надзявай шлем, не забудзь пра рукавіцы.*

### *Урок 47*

### Ужыванне слоў — назваў прадметаў у адказах на пытанні

**197.** Праслухайце.

#### Старэйшы брат

Брат і сястрычка прыйшлі (куды?) у (госць). Дзядуля хуценька палез (куды?) у (шафа), узяў там некалькі (што?) (цукеркі) і даў (каму?) (дзеці).

Петрусёк адразу сказаў:

— Дзякуй.

Сястрычка моўчкі разгарнула адну (што?) (цукерка) і паклала ў рот. Паперыну-абгортку дзяўчынка кінула (куды?) на (падлога). Петрусёк лёгенька



Правообладатель Народная асвета

дакрануўся да яе (да чаго?) (плячо), нячутна нешта сказаў. Сам падняў (што?) (абгортка), скамячыў у руцэ і аднёс у смеццевае вядро.

Гэта ж так пачынаецца выхаванне.

*Паводле П. Кавалёва*

Раскажыце, куды прыйшоў старэйшы брат са сваёй сястрычкай.

Чаму старэйшы брат вучыў малодшую сястру? Як ён гэта рабіў? Прачытайце.

Спішыце першыя два сказы. Змяніце словы па пытаннях.

* **198.** Прачытайце.

Мы едзем далёка (да чаго?) да мора
чужыя глядзець (што?) гарады,
шукаем скалістыя (што?) горы,
азёры крыштальнай вады.

І часта, так часта бывае,
што мы ў сумятлівым жыцці
мінаем і не заўважаем (што?)
красу сваіх родных (чаго?) мясцін.

*М. Хведаровіч*

## Слоўнік

**Сумя́тлівы** — неспакойны.

Раскажыце пра красу сваіх родных мясцін. Калі будзе складана, перачытайце практыкаванне 85.



Правообладатель Народная асвета

**199.** Прачытайце. Разгледзьце малюнак.



Гродна — адзін з самых старажытных (ч а г о?) гарадоў Беларусі. Назва горада паходзіць ад слоў «гарадзіць», «абгароджваць».

Цудоўным помнікам мінулых (ч а г о?) гадоў з'яўляецца Барысаглебская (Каложская) царква. Сцены (ч а г о?) царквы ўпрыгожаны рознакаляровымі (ч ы м?) валунамі і плітамі. Здаецца, нібы царква ўпрыгожана каштоўнымі (чым?) камянямі.

Раскажыце, што вы бачыце на малюнку.

Як узнікла назва беларускага горада Гродна?

Чаму Каложская царква лічыцца цудоўным помнікам мінулых гадоў? Чым яна ўпрыгожана?

Запішыце два-тры сказы пра Каложскую царкву.



## Хвілінка-весялінка

**200.** Прачытайце.

### Намаляваў

Дзеці малявалі зіму. Адзін Пятрок сядзеў без справы.

— Чаго не працуеш? — падышоў да яго настаўнік.

— А я ўжо намаляваў зіму, — адрапартаваў настаўніку Пятрок.

— Дзе? — здзівіўся настаўнік. — У цябе чысты ліст паперы!..



Правообладатель Народная асвета

— Дык зіма ж чыстая, белая. А на вуліцы было холадна. Усе пабеглі грэцца ў хату, — адказаў Пятрок.

*Паводле М. Даніленкі*

Дайце жартаўлівы адказ ад імя настаўніка.

Словы і спалучэнні слоў для даведкі: *ты дарэмна чакаеш, дзеці ўжо пагрэліся і на вуліцы гуляюць; снег на вуліцы не белы, а шэры; перарабі свой «малюнак».*

## Урок 48

### Вялікая літара ў імёнах людзей

**201.** Складзіце імёны дзяцей. Запішыце іх.

Ю, Мары, То, Га, Ва — ля

Ірын, Сяргей, Марын, Гануль, Арцём — ка

Знайдзіце ў дадзеных ніжэй імёнах словы, якія схаваліся. Для гэтага адкідвайце літары ў пачатку або ў канцы слоў. Запішыце знойдзеныя словы.

Уладзімір, Віялета, Соня, Света, Мікіта, Палікарп, Паўліна.

Імёны людзей пішуцца з вялікай літары: ***Марына, Аляксей.***



Правообладатель Народная асвета

**202.** Прачытайце. Адзін вучань чытае за маці, другі — за Марынку, настаўнік — за аўтара.

Марынка прыйшла дамоў вясёлая і гаваркая.

Маці ў яе пытаецца:

— Што ў вас было сёння ў школе?

— Сёння мы вучыліся танцаваць. Лепш за ўсіх танцавалі Ала, Сафія, Вераніка, Карына, Маша.

— А хлопчыкі? — пытаецца маці.

— Хлопчыкі выконвалі фізічныя практыкаванні. Лепшымі былі Руслан, Тарас, Цімур, Якаў.

*Паводле П. Кавалёва*

Запішыце імёны хлопчыкаў і дзяўчынак.

**203.** Прачытайце.

### Як дзеда дзялілі

Мама слухала-слухала, як Натка і Светка сварацца за дзеда, і не вытрымала. Паставіла прас.

— Хопіць мучыць дзеда! А то ў куток пастаўлю: адну — у адзін, другую — у іншы. Да самай «Калыханкі».

— А хай яна не лезе! Гэта мой дзед! — крычала Светка і ўскарабквалася на дзедава калена.

— Не, мой! — лезла на другое калена Ната.

Дзед збянтэжана і расчулена ўсміхаўся, гладзіў унучак па галоўках.

— Ты на тым калене сядзі, а ты — на гэтым, — сказаў ён...

*Паводле П. Місько*

Адкажыце пісьмова на пытанні.

Як звалі сястрычак?



Правообладатель Народная асвета

Чаму сварылася на іх мама?
Як дзед мірыў унучак?
Што вы параіце дзяўчынкам?

Словы для даведкі: *не сварыцца, сябраваць, дзеда абдымаць.*

**204.** Прачытайце лічылку. Падлічыце, колькі ўсяго дзяцей.

* * *

Ля Яўгена села Лена.
Ля Генадзя села Ядзя.
Каля Зосі — два Антосі.
Каля Надзі — два Аркадзі.
Каля Янкі — тры Святланкі.
Каля Пашы — тры Наташы.

*Паводле Н. Парукава*

Выпішыце спачатку імёны дзяўчынак, потым імёны хлопчыкаў.
Запішыце імёны вучняў вашага класа.
Запішыце імёны сваіх сяброў.

**205.** Прачытайце прыказкі пра сяброўства.

1. Сябар даражэйшы за грошы.
2. Не той сябар, хто мёдам мажа, а той, хто праўду кажа.
3. Новых сяброў набывай, а старых не забывай.
4. Скажы мне, хто твае сябры, і я скажу, хто ты сам.

Як вы разумееце гэтыя прыказкі?
Запішыце ў сшытку тры прыказкі, якія вам больш за ўсё падабаюцца.
Вывучыце запісаныя вамі прыказкі на памяць. Ужывайце ў маўленні.



Правообладатель Народная асвета

## Урок 49

### Вялікая літара ў імёнах па бацьку

**206.** Прачытайце.

### Настаўніца

Раптам у кватэру пазванілі. Мама адчыніла дзверы. На парозе стаяў статны лётчык з букетам кветак.

— Гэта я, Аксана Сямёнаўна, ваш вучань, былы неслух і гарэза.

Ён пацалаваў маму і ўручыў ёй кветкі...

— Які ты дарослы стаў! А слова «заданне» з адным «н» пішацца ці з двума?

— З двума, Аксана Сямёнаўна. Шмат чаму вы мяне навучылі. Цяпер я ведаю, што настаўнік не толькі вучыць прадмету. Ён яшчэ рыхтуе людзей да жыцця.

*Паводле Д. Ткача*

Якое імя і імя па бацьку ў настаўніцы? Чаму яна вучыць?

Запішыце імя і імя па бацьку вашай настаўніцы.

Запішыце імёны і імёны па бацьку вашых бацькоў, вашых бабуль і дзядуль. Падкрэсліце вялікую літару ў імёнах і імёнах па бацьку.

Імёны па бацьку пішуцца з вялікай літары: *повар Зоя* ***І****ванаўна, урач Арцём* ***В****італьевіч.*

**207.** Праслухайце тэкст. Раскажыце яго па плане.

### Развітальны круг

Раздаўся стрэл. Трывожна закрычалі птушкі і набралі вышыню.



Правообладатель Народная асвета

Паранены журавель спусціўся на поле. Ён нібы клікаў на дапамогу. Дзеці забралі параненага жураўля. Птушка жыла ў настаўніка Івана Сяргеевіча ў дрывотні. Хлопцы старанна яе даглядалі.

Мінула шэсць дзён. Крыло птушкі загаілася. Ціхай сонечнай раніцай над сялом плыла чарада жураўлёў. Хлопцы выпусцілі на волю маладога жураўля. Ён зрабіў над сялом круг і далучыўся да чарады.

— Бачылі, як журавель развітаўся з намі? — спытаў Іван Сяргеевіч. — Гэта ён дзякаваў нам за дапамогу, за нашу дабрыню.

*З часопіса «Бярозка»*

Што здарылася з маладым жураўлём?
Хто даглядаў параненую птушку?
У каго жыў журавель?
Што было праз шэсць дзён?
Як птушка дзякавала за дапамогу?
Запішыце адказ на тры апошнія пытанні. Напішыце імя і імя па бацьку настаўніка.

**208.** У кіраўніка вашага гуртка сёння дзень нараджэння. Падпішыце паштоўку ці напішыце віншаванне на дошцы. Выкарыстайце ўзор.

**Дарагая Марыя Пятроўна!**

Віншуем Вас з днём нараджэння!
Жадаем Вам добрага здароўя і поспехаў у працы.

*Вучні 4-га класа*



Правообладатель Народная асвета

**209.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце, як завуць урача, повара, будаўніка, шахцёра.



Урач
Ірына Сяргееўна



Повар
Юлія Алегаўна



Будаўнік
Піліп Цімафеевіч



Шахцёр
Уладзімір Вітальевіч

Запішыце імёны і імёны па бацьку. Утварыце ад дадзеных імёнаў імёны па бацьку.

*Міхаіл — Іван Міхайлавіч.*
*Вольга Міхайлаўна.*
Алег — Піліп ... .
Юлія ... .
Іван — Сяргей ... .
Галіна ... .
Сямён — Сямён ... .
Людміла ... .



Правообладатель Народная асвета

## *Урок 50*

### Вялікая літара ў прозвішчах людзей

**210.** Прачытайце.

Андрэй Гурыноў, Аліса Кісель, Галіна Марцінкевіч, Васіліса Чэркас, Іван Трацько, Ірына Шурупава, Стась Пятроў.

Выпішыце імёны і прозвішчы дзяўчынак. Падкрэсліце ў словах вялікую літару.

Прозвішчы людзей пішуцца з вялікай літары: *Марыя **Квітко***, Аляксей Іванавіч ***Зіневін***.

**211.** Прычытайце тэкст і пажаданне аднакласніку.

У Юрыя Мазуркевіча сёння дзень нараджэння. Мама прынесла ў школу цукеркі і сок. Аднакласнікі падарылі яму футбольны мяч. Аксана Ждановіч падпісала паштоўку:

***Дарагі Юрый!***

Віншуем цябе з днём нараджэння!
Жадаем табе здароўя і поспехаў у вучобе.

*Твае аднакласнікі*

Выкажыце вусна хлопчыку свае добрыя пажаданні.

Спалучэнні слоў для даведкі: *моцнага здароўя, спартыўных дасягненняў, надзейных сяброў, цікавых сустрэч, смачных падарункаў, сонечнага настрою.*



Правообладатель Народная асвета

**212.** Складзіце і запішыце па ўзоры віншавальную паштоўку сябру або сяброўцы. Напішыце сваё імя і прозвішча з вялікай літары.



## Хвілінка-весялінка

**213.** Прачытайце жартоўны верш.

### Вось якія пары!

Удалыя пары
ў нас падабраліся...

За парту са Смехавым
сеў Гаруноў,
Выдатная пара —
Марозаў і Жараў,
з Авечкіным — Волкаў,
з Бяловым — Чарноў,
Кудраўцаў з Лысенка —
цудоўная пара!

*Н. Гілевіч*

Выпішыце ўдалыя, выдатныя, цудоўныя пары прозвішчаў. Што ў іх смешнага? Падкрэсліце вялікую літару ў прозвішчах.



## Паразмаўляем

**214.** Прачытайце. Разыграйце ў пары знаёмства па ўзоры.

У з о р.

— Давай пазнаёмімся, — сказала адна дзяўчынка другой. — Мяне завуць Галіна Осіпчык. Я з Брэста. А як завуць цябе?

— А мяне завуць Галіна Несцяровіч. Я з Гомеля.

— Вельмі прыемна. Будзем сябраваць.



Правообладатель Народная асвета

## *Урок 51*

### Вялікая літара ў мянушках жывёл

**215.** Прачытайце. Дапоўніце сказы мянушкамі жывёл. Запішыце.

| | | |
|---|---|---|
| Мышэй ловіць кот | Барбос | Шарык |
| Малачко дае карова | Стракатка | Раба |
| Зярняткі збірае курыца | Мурзік | Петрык |
| Костачку грызе сабака | Зорка | Буронка |

Мянушкі жывёл пішуцца з вялікай літары: *сабака **Шарык**, кот **Макс**.*

* **216.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце подпісы пад малюнкамі. Дапоўніце іх назвамі жывёл.



1. ... Пятачок. 2. ... Вiнi-Пух. 3. ... Гена. 4. ... Том. 5. ... Джэры.

Якi з гэтых мультфільмаў вы глядзелі? Раскажыце яго.

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *мышаня, кот, парася, медзведзяня, кракадзіл.*



Правообладатель Народная асвета

**217.** Прачытайце словы. Складзіце з імі сказы. Выкарыстайце прыведзеныя ніжэй мянушкі.

1. Брэша ... . 2. Мяўкае ... . 3. Мыкае ... . 4. Квохча ... . 5. Іржэ ... .

Спалучэнні слоў для даведкі: *курачка Сняжынка, сабака Бобік, кот Рыжык, карова Зорка, конь Гняды.*



## Хвілінка-весялінка

**218.** Прачытайце. Чаго не ведае маленькі хлопчык? Шарык — гэта прадмет ці мянушка сабачкі?

Маленькі Гена ўбачыў на двары сабачку і пытаецца ў таты:

— Як завуць сабачку?
— Яго завуць Шарык.
— А чаму ён не круглы?

Раскажыце Гене, якія прадметы бываюць круглымі.

## *Урок 52*

### Вялікая літара ў назвах гарадоў, вёсак, рэк і азёр

**219.** Прачытайце. Чаму верш мае такую назву? Як называецца краіна, у якой мы жывём? Як называецца горад — сталіца нашай краіны? Запішыце.

**Беларусь**

Тут Дняпро бяжыць прывольна,
Сож, Бярэзіна, Дзвіна,
Прыпяць, Шчара, Свіслач, Нёман,
Вілля, Піна, Буг, Дзвіна.



Правообладатель Народная асвета

Тут крыштальныя азёры —
Нарач, Свіцязь, Снуды, Свір.
Полацк — наш найпершы горад.
Віцебск, Тураў, Кобрын, Мір.

*М. Пазнякоў*

Выпішыце з верша назвы рэк, што бягуць па беларускай зямлі, назвы азёр. Запішыце гарады, якія названы ў вершы. Запішыце і тыя гарады, якія вы яшчэ ведаеце.

Узор. *Рэкі*: Дняпро, ..., ... .
*Азёры*: Нарач, ..., ... .
*Гарады*: Полацк, ..., ... .

Назвы краін, гарадоў, вёсак, вуліц, рэк, азёр, мораў пішуцца з вялікай літары: ***Беларусь, Мінск, Свіслач, Нарач.***

**220.** Разгадайце рэбусы і запішыце назвы беларускіх гарадоў.







**221.** Прачытайце словы. Да слоў, якія называюць гарады, падбярыце назвы жыхароў. Запішыце словы парамі.

Узор. *Орша — аршанцы.*

Орша, Гродна, Мінск, Віцебск, Гомель, Маладзечна, Жодзіна.

Словы для даведкі: *аршанцы, мінчане, гродзенцы, віцябляне, маладзечанцы, жодзінцы, гамяльчане.*



Правообладатель Народная асвета

**222.** Прачытайце. Спішыце тэкст. Падкрэсліце вялікую літару ў назвах вёсак.

У Вольгі і Ларысы ёсць бабуля Паліна. Яна жыве ў вёсцы Вялікія Укропавічы. Побач знаходзяцца вёскі Малыя Укропавічы, Дзяніскі, Казыры.

У якой вёсцы або горадзе жывуць твае бабулі і дзядулі? Запішыце назвы вёсак або гарадоў сваіх бабуль і дзядуль. Напішыце імёны, імёны па бацьку і прозвішчы бабуль і дзядуль.

## *Урок 53*

### Вялікая літара ў назвах вуліц. Хатні адрас

**223.** Разгледзьце канверт. Запомніце, як правільна падпісваецца на канверце адрас. Знайдзіце і зачытайце назву месца прызначэння, адрасата і зваротны адрас. Чаму падпісаны адрас павінен быць дакладны і поўны?




Падпішыце канверт або паштоўку суседу па парце, а ён няхай падпіша вам. Праверце адзін аднаго.



Правообладатель Народная асвета

* **224.** Адкажыце на пытанні пісьмова.

Як называецца ваш горад (ваша вёска)?

На якой вуліцы вы жывяце?

Якія вёскі (гарады) знаходзяцца побач з вашым горадам (вашай вёскай)?

Як называецца рэчка, што цячэ недалёка ад таго месца, дзе вы жывяце?

Як называецца возера каля таго месца, дзе вы жывяце?

**225.** Разгледзьце малюнак.



Праслухайце тэкст. Дайце тэксту назву.

Для даведкі. «Старажытны Полацк», «Назвы беларускіх гарадоў», «Помнікі гісторыі Беларусі».

Старажытны Полацк — вельмі прыгожы горад Беларусі. Ён размешчаны на рацэ Палата́.



Правообладатель Народная асвета

Горад Полацк названы па імені ракі. У беларусаў быў звычай называць горад па назве ракі. Напрыклад: Віцьба — Віцебск, Піна — Пінск, Палата — Полацк.

Прыгожа гучаць назвы беларускіх гарадоў!

*Паводле А. Вольскага*

Выпішыце з тэксту назвы беларускіх гарадоў і рэк. Не забывайцеся пісаць іх з вялікай літары.

**226.** Праслухайце.



**Ефрасіння Полацкая**

Вуліцы старажытнага горада Полацка... Па адной з іх спяшаецца дзяўчынка гадоў дзесяці. Гэта Прадслава... Праз хвіліну яна ўжо каля самага вялікага і прыгожага збудавання ў горадзе — Сафійскага сабора. Каля яго лечаць параненых ваяроў. З раніцы да вечара дапамагае Прадслава сваёй цётцы Раманіі. Каму вады паднясе, каму слова ласкавае скажа.

Ведалі Ефрасінню Полацкую далёка за межамі Полацка. Людзі дзякавалі ёй за дабро.

Ефрасіння вучыла паважаць адзін аднаго. Яна заклікала спыняць войны. Зброя прыносіць у хаты замест хлеба горыч і слёзы. Добрая памяць аб Ефрасінні засталася на зямлі.

*Паводле С. Тарасава*



Правообладатель Народная асвета

## Слоўнік

**Ваяры́** — воіны, што змагаюцца з ворагам.

У якім горадзе жыла Прадслава?

Чым яна займалася каля Сафійскага сабора?

Чаму слава пра Ефрасінню Полацкую разышлася далёка за межамі Полацка? Чаму яна вучыла людзей?

Спішыце чатыры апошнія сказы тэксту.

Прачытайце прыказкі. Аб чым у іх гаворыцца?

Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка.
Усякаму міла свая старана.
Усюды добра, а дома — лепш за ўсё.
Ля сонца цёпла, ля дома добра.

Запішыце прыказку, якая вам больш спадабалася.



Правообладатель Народная асвета

## Арфаграфічны слоўнік

Агрэ́ст
агуро́к
ало́вак
аўто́бус
агаро́д

Белару́сь
бу́льба
бура́к
бу́сел
бяро́за

Ваверка
верабе́й
ве́расень
ве́цер
ві́шня
во́жык
во́сень
ву́чань
вясна́

Гняздо́
го́рад
гру́ша
грыб

Дая́рка
дзіця́
дзяўчы́нка
дзя́цел
до́ждж

Жні́вень
жо́луд
жо́ўты
жураве́ль
жывёла
жы́та

Заво́д
зара́дка
зіма́
зямля́

Іго́лка
імя́
індык
ісці́

Капу́ста
каро́ва
касмана́ўт
кастры́чнік
кве́тка
клас
конь



Правообладатель Народная асвета

красаві́к
ку́рыца

**Л**е́та
лі́пень
лы́жа
лю́ты
лістапа́д

**М**алато́к
мале́нькі
малі́ны
маро́з
Масква́
Мінск
мо́рква
мэ́бля

**Н**авальні́ца
надво́р’е
надзе́ць
называ́цца
нараджэ́нне
На́рач
Нёман
наста́ўнік
ні́зкі
нядзе́ля

**П**арэ́чкі
патэ́льня
пачына́цца
паштальён
пе́вень
пена́л
піла́
пло́шча
пра́ца
про́звішча
пту́шка
пшані́ца

**Р**абі́на
рабо́чы
ра́дасць
Радзі́ма
ракета
Расі́я
расцвісці́
рознакаляро́вы
руча́й
ру́чка

**С**адавіна́
сакаві́к
сало́дкі
самалёт
са́нкі



Правообладатель Народная асвета

святлафо́р
сёння
слі́ва
снег
сне́жань
со́нца
сту́дзень
сшы́так
сяке́ра
сястры́чка
сяўба́

Тава́рыш
тале́рка
тра́ктар
тра́ле́йбус
трохвуго́льнік
тэлеві́зар
тэлефо́н

Удзя́чнасць
Украі́на
упрыго́жанне
ураджа́й
урадзі́ць

Фарбава́ць
фа́рбы
фіяле́тавы
флама́стар

фе́рма
фу́тра

Халадзі́льнік
хма́ра
хо́лад

Цудо́ўны
цыбу́ля
цымба́лы
цюльпа́н
ця́жкі (цяжкі́)

Чалаве́к
чацве́р
чырво́ны
чэ́рвень

Шаве́ц
шафёр
шко́льнік
шпако́ўня
шча́сце
шчы́ры

Экску́рсія

Юна́к

Я́блык
я́блыня



Правообладатель Народная асвета

## Спіс выкарыстанай літаратуры

Бадак, А. Маленькі чалавек у вялікім свеце / А. Бадак. — Мінск: Ураджай, 1995.

Буся: 2016. — № 2; 2019. — № 4.

Вітка, В. Выбраныя творы / В. Вітка. — Мінск: Беларуская навука, 2013.

Вясёлка: 1988. — № 11—12; 1990. — 1, 2, 5, 7, 10, 11, 12.

Карнеева, Г. А. Выпраўленне гукамаўлення ў дзяцей / Г. А. Карнеева. — Мінск: Народная асвета, 1998.

Клышка, А. К. Верасок / А. К. Клышка. — Мінск: Народная асвета, 1978.

Клышка, А. К. Чую, бачу, гавару: вучэбна-наглядны дапам. / А. К. Клышка. — Мінск: Асар, 2013.

Ліпскі, У. Часопіс-маляванка для дашкольнікаў «Буся». № 2, 2016.

Старжынская, Н. С. Займальны матэрыял па навучанню грамаце / Н. С. Старжынская. — Мінск: Народная асвета, 1989.

Старжынская, Н. С. Навучанне дашкольнікаў роднай мове / Н. С. Старжынская. — Мінск: Народная асвета, 1985.

Сторажава, Н. А. Мова мая і твая. Вучу дзяцей па-беларуску / Н. А. Сторажава. — Мінск: Выд. А. Ванін, 1993.

Сцяжынка: Чытанка для 3—4 кл. / аўтар-склад. Г. Каржанеўская. — Мінск: НМЦэнтр, 1997.

Шылько, Т. М. З роднай мовай дзень за днём / Т. М. Шылько. — Мінск: Народная асвета, 1999.



Правообладатель Народная асвета

# ЗМЕСТ

## ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА Ў 3-М КЛАССЕ

Урок 1 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Урок 2 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
Урок 3 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
Урок 4 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
Урок 5 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
Урок 6 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15
Урок 7 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
Урок 8 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19

## ТЭКСТ

Урок 9. Адрозненне тэксту ад сказаў. . . . . . . . . . . . 22
Урок 10. Адрозненне тэксту ад сказаў . . . . . . . . . . . 25
Урок 11. Тэма тэксту. Назва тэксту . . . . . . . . . . . . 28
Урок 12. Чырвоны радок у пачатку тэксту. Абзац 31
Урок 13. Узнаўленне дэфармаванага тэксту . . . . . . 33
Урок 14. Падзел тэксту на сказы . . . . . . . . . . . . . . 36
Урок 15. Сувязь сказаў у тэксце . . . . . . . . . . . . . . 38
Урок 16. Сувязь сказаў у тэксце . . . . . . . . . . . . . . 40
Урок 17. Пераказ тэксту па пытаннях і па дадзеным плане . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 43
Урок 18. Калектыўнае складанне невялікага тэксту 45

## СКАЗ

Урок 19. Сказ як адзінка маўлення . . . . . . . . . . . . 47
Урок 20. Вычляненне сказа з тэксту . . . . . . . . . . . . 49



Правообладатель Народная асвета

Урок 21. Вычляненне сказа з тэксту . . . . . . . . . . . . . . 52
Урок 22. Вычляненне сказа з тэксту . . . . . . . . . . . . . . 54
Урок 23. Вызначэнне, пра што або пра каго гаворыцца ў сказе . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
Урок 24. Вызначэнне, пра што або пра каго гаворыцца ў сказе . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
Урок 25. Вызначэнне, пра што або пра каго гаворыцца ў сказе . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
Урок 26. Графічнае адлюстраванне сказа . . . . . . . . . 65
Урок 27. Вялікая літара ў пачатку сказа . . . . . . . . 67
Урок 28. Вялікая літара ў пачатку сказа . . . . . . . . . 69
Урок 29. Заканчэнне сказа адным або некалькімі словамі з дапамогай пытанняў . . . . . . . . . 72
Урок 30. Заканчэнне сказа адным або некалькімі словамі з дапамогай пытанняў . . . . . . . . . 74
Урок 31. Пашырэнне сказа адным або некалькімі словамі па пытаннях . . . . . . . . . . . . . . . . 76
Урок 32. Пашырэнне сказа адным або некалькімі словамі па пытаннях . . . . . . . . . . . . . . . . 78
Урок 33. Пашырэнне сказа адным або некалькімі словамі па пытаннях . . . . . . . . . . . . . . . . 80
Урок 34. Складанне сказаў па пытаннях настаўніка 83
Урок 35. Складанне сказаў па пытаннях настаўніка 85
Урок 36. Складанне сказаў па пытаннях настаўніка 88
Урок 37. Упарадкаванне дэфармаванага сказа . . . . 89
Урок 38. Упарадкаванне дэфармаванага сказа . . . . 91



Правообладатель Народная асвета

## СЛОВЫ
## СЛОВЫ — НАЗВЫ ПРАДМЕТАЎ

Урок 39. Вычляненне слова са сказа . . . . . . . . . . . . 93
Урок 40. Словы як назвы прадметаў, прымет прадметаў і дзеянняў прадметаў. . . . . . . . . 96
Урок 41. Словы як назвы прадметаў, прымет прадметаў і дзеянняў прадметаў. . 99
Урок 42. Словы — назвы прадметаў . . . . . . . . . . . . . 101
Урок 43. Вызначэнне слоў — назваў прадметаў па пытаннях . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
Урок 44. Падбор слоў, якія адказваюць на пытанні хто? што?. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 105
Урок 45. Ужыванне слоў — назваў прадметаў у адказах на пытанні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107
Урок 46. Ужыванне слоў — назваў прадметаў у адказах на пытанні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108
Урок 47. Ужыванне слоў — назваў прадметаў у адказах на пытанні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 110
Урок 48. Вялікая літара ў імёнах людзей . . . . . . . . . 113
Урок 49. Вялікая літара ў імёнах па бацьку . . . . . . 116
Урок 50. Вялікая літара ў прозвішчах людзей . . . . 119
Урок 51. Вялікая літара ў мянушках жывёл . . . . . . 121
Урок 52. Вялікая літара ў назвах гарадоў, вёсак, рэк і азёр . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 122
Урок 53. Вялікая літара ў назвах вуліц. Хатні адрас 124

Арфаграфічны слоўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
Спіс выкарыстанай літаратуры . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131



Правообладатель Народная асвета

Вучэбнае выданне

**Ляшчынская** Таццяна Лаўрэнцьеўна
**Аніскевіч** Святлана Сцяпанаўна

# Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік для 4 класа першага аддзялення дапаможнай школы з беларускай мовай навучання

У 2 частках

Частка 1

2-е выданне, перапрацаванае

Заг. рэдакцыі *Г. А. Бабаева*. Рэдактар *К. І. Чэрнікава*.
Мастацкі рэдактар *А. А. Жданоўская, А. А. Праваловіч, А. П. Пратасеня*.
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *А. Ю. Агафонавай*.
Карэктары *А. П. Тхір, В. С. Казіцкая, Г. В. Алешка*.

Падпісана да друку 21.09.2020. Фармат 70 × 90 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 9,95 + 0,29 форз.
Ул.-выд. арк. 4,08 + 0,42 форз. Тыраж 366 экз. Заказ .

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Народная асвета» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/2 ад 08.07.2013. Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014. Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск, Рэспубліка Беларусь.

Правообладатель Народная асвета

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Правообладатель Народная асвета

# ХТО? ШТО?







**Дзяўчынкі і хлопчыкі**

збіралі што?
даглядалі каго?



# Адзін — многа







хлопчык — хлопчыкі
дзяўчынка — дзяўчынкі
галінка — галінкі
птушка — птушкі
фіялка — фіялкі



